WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 ЛІПЕНЯ 2010 г. СУБОТА № 143 (26751)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Паважаныя работнікі і ветэраны органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь!**

Ад усёй душы віншую вас са святам — Днём пажарнай службы!

За паўтара стагоддзі свайго службова-баявога шляху, звязанага з трывогамі і небяспекамі, беларускія пажарныя неаднаразова дэманстравалі самаадданасць, стойкасць і адвагу.

Асаблівай старонкай — і гераічнай, і трагічнай — у гісторыі пажарнай службы Беларусі стаў удзел у ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Тысячы пажарных нашай рэспублікі ліквідавалі наступствы найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофы XX стагоддзя, ахвяруючы ўласным здароўем і жыццём дзеля выратавання мільёнаў людзей.

Сёння падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях маюць магутны патэнцыял і здольныя аператыўна рэагаваць на любыя пагрозы прыроднага і тэхнагеннага характару, якія ўзнікаюць, на высокім узроўні вырашаць пастаўленыя задачы.

Упэўнены, што вы і надалей будзеце ўзорам адданага служэння свайму народу і годна несці службу ў імя росквіту нашай краіны.

У гэты святочны дзень шчыра зычу ўсім супрацоўнікам і ветэранам, іх родным і блізкім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «Усё павінна быць пастаўлена на службу чалавеку»

**Дзяржава не будзе адмаўляцца ад прынцыпаў сацыяльна арыентаванай эканомікі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб перспектывах развіцця ААТ «Гродна Азот» падчас рабочай паездкі ў Гродзенскую вобласць.**

«Скажу проста: сутнасць нашай палітыкі заключаецца ў тым, што ўсе гэтыя аміяк, карбамід, гайкі, каровы, быкі — усё гэта нішто перад чалавекам. Усё павінна быць пастаўлена на службу чалавеку, — сказаў Прэзідэнт. — Так, вытворчасць, але толькі ў імя адной мэты — чалавека. Мы 15 гадоў праводзілі такую палітыку і ад яе не адыдзем».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нельга любой цаной уздымаць эфектыўнасць вытворчасці. Ён упэўнены ў тым, што няма нічога дрэннага, што ў Беларусі існуюць пэўныя сацыяльныя нагрузкі на прадпрыемствы. «Кожны чалавек акрамя зарплаты павінен мець магчымасць ездзіць у санаторыі, але самае галоўнае — гэта дзеці, каб працаўнікі гэтага калектыву свае дзіця мелі магчымасць павесці ў дзіцячы сад, у школу адправіць і каб прадпрыемства за гэта несла адказнасць. Гэта вышэйшая мэта любога чалавека, і ніякія рынычныя адносіны гэтага не заменяць».

Беларусь не збіраецца адмаўляцца ад абвешчаных прынцыпаў прыватызацыі. «Прынцыпы прыватызацыі ў краіне аб'яўлены, падабаюцца яны каму-небудзь ці не. Ёсць 20-25 умоў, выконвай іх — і будзем дамаўляцца. Але самае галоўнае — плаці грошы, павышай зарплаты людзям, падаткі ў бюджэт, рабі эфектыўную вытворчасць, і тады з любым гаспадаром мы будзем весці размову», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы такіх інвестараў, якія гатовы ўкласціся ў гэта прадпрыемства («Гродна Азот». — **Заўвага БЕЛТА**), шукалі даўно, выкарыстоўвалі розныя метады, і не толькі я гэтым займаўся, але і ўрад, міністэрствы і ведамствы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым ён падкрэсліў, што пры мадэрнізацыі прадпрыемства або будаўніцтве новага завода галоўнае — гэта людзі, і ў першую чаргу адзін чалавек — кіраўнік, які павінен быць добрым прафесіяналам. «Мне было прапанавана групай інвестараў прыватызаваць гэта прадпрыемства з далейшым будаўніцтвам новага завода і прадаўжэннем мадэрнізацыі, якую пачала дзяржава. Я адкрыта гавару, што я адразу ж, з парога адмёў усе прапановы па прыватызацыі — не таму, што мы супраць прыватызацыі, а таму, што, прыватызуючы флагман беларускай эканомікі, трэба ведаць, у чые рукі трапіць гэта прадпрыемства, наколькі новы гаспадар здольны працаваць лепш, чым працаваў стары, гэта значыць дзяржава», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Пазнаёміўшыся з Ігарам Фёдаравічам Жылiным (в.а. гендырэктара ААТ «Гродна Азот». — **Заўвага БЕЛТА**), я яму прапанаваў (гэта не ён прапаноўваў прыватызацыю — яго прыцягвалі як менеджара, які забяспечыць пасля прыватызацыі нармальную работу і значна прыбавіць у эфектыўнасці вытворчасці): ідзі папрацуй, пакажы, у якім напрамку будзе ісці прыватызацыя, аб'ектыўна разбярыся на прадпрыемстве з калектывам — і дaложыш праз год», — расказаў Прэзідэнт. «Калі я ўбачу, што вы як кіраўнік і тыя людзі, якія, магчыма, з вамі прыйдуць, эфектыўныя ў кіраванні і арганізацыі спраў, — мы разгледзім пытанне і аб продажы нейкай долі акцый не толькі стратэгічнаму інвестару, калі ён знойдзецца, але і вам асабіста», — падзяліўся ён падрабязнасцямі размовы, якая адбылася ў 2009 годзе.

Пры гэтым быў пастаўлены шэраг умоў. «Для мяне як Прэзідэнта важна тое, што там працуе калектыў (больш як 7 тыс. чалавек), які павінен праз кароткі прамежак часу сказаць, што Прэзідэнт паступіў правільна, прыслаўшы сюды новага чалавека, — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка. — Па-другое — гэта горадаўтваральнае прадпрыемства. Таму ваша задача — з губернатарам і мясцовымі органамі ўлады працаваць разам: вы забяспечваеце вялікі рэгіён, заходні рэгіён, і нам тут праблем не трэба. Вы ведаеце, як часам паводзяць сябе нашы суседзі, таму тут павінен быць ідэальны парадак, людзі павінны быць задаволены не толькі на прадпрыемстве, але і ў горадзе, і ў вобласці ў цэлым. Трэцяе — я вам даю карт-бланш на тое, каб разабрацца з калектывам, але рабіце гэта акуратна, заўсёды дайце людзям шанц, вызваляючыся ад тых, хто не хоча працаваць».

Такім чынам, сённяшняя нарада — лагічнае прадаўжэнне размовы аб перспектывах развіцця ААТ «Гродна Азот», якая адбылася ў красавіку 2009 года. А паўторна гэта пытанне абмяркоўваецца на самым высокім узроўні менавіта таму, што гэта прадпрыемства — флагман беларускай індустрыі, і ад яго ў многім залежыць паспяховае развіццё ўсяго беларускага нафтахімічнага комплексу, сельскай гаспадаркі.

Кіраўнік беларускай дзяржавы ўпэўнены, што эканамічная сітуацыя ў Беларусі не пагоршыцца. «Я не думаю, што ў нас сітуацыя пагоршыцца, як бы там ні трапяталіся на Усходзе, у іншых месцах, — сказаў Прэзідэнт. — Але ў гэтым годзе трэба зрабіць максімум».

У час даклада губернатара Гродзенскай вобласці Сямёна Шапіры аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёну абмяркоўваліся праекты па будаўніцтве малочнатаварных фермаў. Ужо цяпер у Гродзенскай вобласці працуюць сучасныя жывёлагадоўчыя комплексы.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў неабходнасць перш за ўсё арыентавацца на больш танныя варыянты пры будаўніцтве такіх аб'ектаў, але не ва ўрон якасці. «Неабходна будаваць функцыянальныя і акупныя аб'екты», — адзначыў ён.

Такім чынам, сказаў Аляксандр Лукашэнка, стварэнне аграгарадкоў, збожжатакоў, машынных двароў у гэтай пяцігодцы будзе завершана, а ў наступнай пяцігодцы застанецца пабудаваць аб'екты пад малочную і мясную жывёлагадоўлю.

Цяпер неабходна мабілізаваць усе рэсурсы для ўборкі кукурузы. «Нам трэба цяпер мабілізаваць усё для ўборкі кукурузы, цяпер трэба думаць пра другую хвалю ўборкі. Я бачу, што збожжавыя (каласавыя) мы ўбяром, і цяпер самае галоўнае ўбраць кукурузу, якая дасць значную прыбаўку», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Як далажыў Прэзідэнту міністр сельскай гаспадаркі і харчавання краіны Міхаіл Русы, сярэдняя ўраджайнасць збожжавых па рэспубліцы цяпер складае прыкладна 31,1 ц/га. У сваю чаргу ў Гродзенскай вобласці ўраджайнасць складае 42,2 ц/га. Уборка актыўна праводзіцца ва ўсіх рэгіёнах краіны, кожны дзень убіраецца амаль 5 працэнтаў плошчаў.

Як адзначыў Міхаіл Русы, чакаецца, што ўжо сёння аграрыі рэспублікі выйдуць на намалот 2 млн тон збожжа. Усяго ж плануецца намалаціць больш як 8 млн тон збожжавых (каласавых).

Даходамі ад высокай кан'юнктуры цэнаў на сельгаспрадукцыю неабходна падзяліцца з работнікамі вёскі. «У сувязі з тым, што склалася на рынку, трэба падзяліцца з сялянамі, і нават не падзяліцца, а перш за ўсё трэба даць сялянам, а потым ужо, што застанецца — перапрацоўшчыкам, сабе, у бюджэт, — сказаў Прэзідэнт. — Трэба галоўных «віноўнікаў» станоўчых вынікаў узнагародзіць грашыма і прыняць адпаведнае рашэнне на ўзроўні рэспублікі ў цэлым».

У прыватнасці, размова ішла аб тым, што ў гэтым годзе ў сувязі са складанымі ўмовамі надвор'я ўзрос попыт на прадукцыю сельскай гаспадаркі, а адпаведна — выраслі цэны на сусветным рынку. Напрыклад, пастаянна растуць цэны на сухое малако, што выпрацоўваецца ў Беларусі, рапс, іншыя віды сельгаспрадукцыі і прадуктаў яе перапрацоўкі. Акрамя таго, напрыклад, ужо цяпер паступаюць прапановы з Расіі аб продажы саломы.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка ўказаў на неабходнасць не толькі фінансава заахвочваць працаўнікоў вёскі за дасягнутыя вынікі, але і ўдзяляць увагу правільнай стратэгіі рэалізацыі беларускай прадукцыі на замежных рынках.

Кропка на планеце Зямля






## ЛЕПЕЛЬСКІЯ ЗВЯЗДОЎЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхароў гэтага населенага пункта мы маем права не без падстаў называць цёзкамі. А звяздоўцамі яны сталі, па словах старшыні мясцовага сельскага Савета Валянціны Навагран, у 70-х гадах, калі вёску Аўгустова перайменавалі ў Звязду.**

— Яе назвалі па-руску «Звездою», але, як вядома, тапаграфічныя назвы пры перакладзе не мяняюцца, — удакладняе Валянціна Сцяпанаўна і таксама лічыць, што вёска на беразе маляўнічага возера Цяклец — пабрацім калектыву старэйшай штодзённай газеты нават за тое, што нямала яе жыхароў з'яўляюцца нашымі сталымі падпісчыкамі. — Застаецца толькі бліжэй пазнаёміцца і распачаць сяброўства.

І на правах жыхаркі вёскі Валянціна Сцяпанаўна запрашае звяздоўцаў са сталіцы ў гэты край, багаты на грыбы, ягады і, вядома, рыбу (бо наўкол шмат і лесу, і азёр), абяцаючы, што мы адчуем шчырую гасціннасць лепельскіх звяздоўцаў. А пакуль мы вялі гамонку пра паходжанне і прыгожае размяшчэнне вёскі, самыя юныя жыхары Ганна Хрышчэнка з братамі Алегам і Яўгенам Галінскімі хутка знайшлі ў бабулінай хаце свежы нумар газеты і, усеўшыся на новенькія дошкі, узяліся разглядаць «Звязду», нібы яны і ёсць самыя шчырыя нашыя прыхільнікі. Спадзяюся, такімі яны неўзабаве і стануць.

СТАР. 6



## СПЯКОТНАЕ ЖНІВО НА ЗАВЕЧАЛЬСКІХ ПАГОРКАХ

**Хлебаўборачныя звёны СВП «Ушацкі райаграсэрвіс» паказваюць лепшыя ў раёне намалоты і дастаўку збожжа. Сярод лепшых камбайнераў — экіпаж Канстанціна Казакевіча і Сяргея Андрэйчыка. Яшчэ летась і пазалетась Сяргей і Канстанцін у час жніва працавалі паасобку на старэнькіх «Донах», а сёлета вырашылі аб'яднацца і малаціць добры ўраджай на новым айчынным «Палессі».**

**— Мы задаволеныя сваім камбайнам, як і ў цэлым ходам гэтай уборачнай, хоць на нашых ушацкіх пагорках жніво ідзе крыху болей за тыдзень і тэмпература штодзень 30-32 градусы, — кажуць маладыя, але ўжо вопытныя майстры хлебных палеткаў і, выгрузіўшы чарговы бункер ды змахнуўшы кроплі поту са скроняў, зноў накіроўваюць свой КЗС-1218 у жніўны клін.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




Мінскій городской центр недвижимости

**ОТКАЗ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА по лоту № 2**

В извещении о проведении 30 июля 2010 года 101-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска («Звязда» от 17 июля 2010 г.) **лот № 2 исключается из публикации.**

**Телефон для справок 227 40 22.**

## НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ СТАНЕ КРЫХУ ПАХАЛАДАЕ

**У гэтыя выхадныя дні ў Беларусі захаваецца анамальна гарачае надвор'е, паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.**

Пры паступленні ў Беларусь гарачых і даволі вільготных паветраных мас субтрапічнага паходжання ў асобных раёнах у суботу, 24 ліпеня, пройдуць кароткачасовыя дажджы і прагрымяць навальніцы. Днём паветра прагрэецца да 30-34 градусаў, месцамі да 35 градусаў.

У ноч на нядзелю, 25 ліпеня, кароткачасовыя дажджы пройдуць у паўднёва-заходняй частцы Беларусі, а днём месцамі па тэрыторыі краіны прагрымяць навальніцы. Пры навальніцах чакаецца ўзмацненне ветру з парывамі да 15-20 метраў за секунду. У начныя гадзіны чакаецца 17-22 градусы вышэй за нуль, у нядзелю днём будзе 27-34 градусы.

У панядзелак, 26 ліпеня, атмасферны фронт, які змяшчаецца з Польшчы, абумовіць у начныя гадзіны месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Пры навальніцах у асобных раёнах узмоцніцца вецер з парывамі да 15-20 метраў за секунду. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад 16 да 22 градусаў цяпла. У панядзелак днём стане крыху халаднавата — ад 21 да 28 градусаў цяпла. На паўночным усходзе Беларусі паветра прагрэецца яшчэ да 29-33 градусаў.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СЕРБІЯ НЕ ПРЫЗНАЕ РАШЭННЕ СУДА ААН ПРА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ КОСАВА

**Сербія не прызнае рашэнне Міжнароднага суда ААН пра незалежнасць Косава, паведамляюць інфармагенцтвы. «Сербія ніколі не прызнае незалежнасць Косава, абвешчаную ў аднабаковым парадку», — заявіў сербскі прэзідэнт Барыс Тадзіч.**

Міжнародны суд ААН 22 ліпеня прызнаў законнасць рашэння ўлад Косава пра абвяшчэнне незалежнасці ад Сербіі. У афіцыйнай рэзідэнцыі суда прысутнічалі прадстаўнікі больш чым 40 дзяржаў. Незалежнасць ад Сербіі была абвешчана парламентам Косава 17 лютага 2008 года. Чакаецца, што пасля рашэння Міжнароднага суда ААН шматлікія дзяржавы, якія лічаць Косава часткай Сербіі, прызнаюць яго незалежнасць.

Раней незалежнасць Косава прызналі 69 краін. Сербія, Расія, КНР, Бельгія і іншыя дзяржавы выказваюцца супраць прызнання Косава.

### СМІ: У РАСІІ З-ЗА КАРУПЦЫІ ТАННЕЙ БЫЛО Б БУДАВАЦЬ ДАРОГІ З ФУА-ГРА І ТРУФЕЛЯЎ



**Карупцыя ў Расіі дасягнула небывалых маштабаў. Высветлілася, што за тыя грошы, якія марнуюцца на будаўніцтва магістраляў у Сочы да Алімпіяды-2014, можна было б выкласці гэтыя дарогі самымі дарагімі далікатэсамі, піша The Daily Telegraph са спасылкай на часопіс Esquire.**

Каля 30 міль (прыблізна 48 км) адной з дарог у горадзе, які рыхтуецца да зімовай Алімпіяды, каштуюць 4,9 млрд фунтаў стэрлінгаў, ці 7,5 млрд долараў. Журналісты падлічылі, што за тыя ж грошы гэты ўчастак дарогі можна было б выкласці пластом гусінай печані фуа-гра таўшчынёй у 20 сантыметраў ці труфелямі — у пяць сантыметраў.

У якасці альтэрнатыўнага дарожнага пакрыцця, якое будзе каштаваць тых жа грошай, калі не меншых, былі прапанаваны вустрыцы, чорная ікра ці футры. На гэтыя сродкі можна было б нават стварыць раўчук з каньяку Hennessy глыбінёй прыблізна 12 сантыметраў.

Такім чынам, выданне хацела звярнуць увагу на тое, што дарогі ў Расіі з'яўляюцца аднымі з самых дарагіх у свеце з-за невыноснай карумпаванасці як федэральных, так і мясцовых чыноўнікаў. Нагадаем, што раней расійскія выданні падлічылі, колькі каштуе ў сярэднім адзін метр дарог у Сочы — каля 200 тысяч долараў. Такія цэны робяць аўтадарожную галіну Расіі адной з самых неэфектыўных і выдатковых у свеце. Напрыклад, будаўніцтва кіламетра чатырохпалоснай дарогі ў Кітаі абыходзіцца ў 2,9 млн, у Бразіліі — у 3,6 млн, у краінах Еўрасаюза — 6,9 млн, у ЗША — 5,9 млн, а ў Расіі — амаль у 13 млн долараў. У Маскве будаўніцтва новых дарог увогуле абыходзіцца даражэй, чым пракладка тунэля пад Ла-Маншам...

### ПХЕНЬЯН АБЯЦАЕ «ЎЖЫЦЬ СІЛУ» Ў АДКАЗ НА САНКЦЫІ ЗША

**Паўночная Карэя паабяцала «ўжыць сілу» на новыя санкцыі ЗША ў сувязі з абвінавачваннем Пхеньяна ў патапленні паўднёвакарэйскага ваеннага карабля «Чхонан» у сакавіку гэтага года. Гэта заява прагучала падчас саміту міністраў замежных спраў краін Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-ўсходняй Азіі.**

На пачатку гэтага тыдня ЗША наклалі санкцыі на Паўночную Карэю ў сувязі з затапленнем паўднёвакарэйскага карабля. У сераду дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан паведаміла, што новыя санкцыі ў першую чаргу закрануць кіраўніцтва ў Пхеньяне. Такім чынам амерыканскае кіраўніцтва вырашыла прадэманстраваць салідарнасць з Сеулам. Акрамя таго, у выхадныя адбудуцца сумесныя амерыканска-паўднёвакарэйскія вучэнні, закліканыя перасцерагчы Пхеньян ад агрэсіўных дзеянняў супраць Паўднёвай Карэі. Прадстаўнік Паўночнай Карэі заявіў, што вучэнні накіраваны «супраць суверэнітэту і бяспекі КНДР». «Пазіцыя КНДР відавочная: у адказ на ваенную пагрозу з боку ЗША будзе ўжыта сіла», — сказаў паўночнакарэйскі прадстаўнік.

### КПРФ ПАТРАБУЕ СПЫНЕННЯ «ЗЛОСНЫХ НАПАДАК» НА БЕЛАРУСЬ

**«КПРФ асуджае палітыку ўладаў Расіі ў дачыненні Беларусі, якая відавочна супярэчыць нацыянальным інтарэсам краіны, патрабуе спынення злосных нападак на Беларусь і яе кіраўніцтва і аднаўлення жыццёва важных для Расіі добрасуседскіх адносінаў з гэтай братэрскай рэспублікай», — гаворыцца ў заяве старшыні ЦК КПРФ Генадзя Зюганава.**

«Чарговы «газавы канфлікт» кіраўніцтва Расіі з Беларуссю перайшоў у стадыю інфармацыйна-прапагандысцкай вайны, — гаворыцца ў заяве. — У апошні час шэраг расійскіх СМІ дапусцілі вострыя, а часам і абразлівыя выпады супраць прэзідэнта Беларусі А.Р.Лукашэнкі. І гэта пры тым, што Беларусь застаецца самым надзейным стратэгічным саюзнікам Расіі, а беларускі народ з'яўляецца братэрскім».



Падыход афіцыйнай Масквы да расійска-беларускіх адносінаў «рашучым чынам супярэчыць нават уласнай замежнапалітычнай дактрыне кіруючай групоўкі РФ». «Цалкам відавочна, што дзеянні расійскіх уладаў у дачыненні Беларусі дыктуюцца зусім не інтарэсамі стратэгічнай бяспекі, як гэта афіцыйна дэкларуецца», — заявіў Зюганаў.

Ён нагадвае «творцам цяперашняй палітыкі РФ», што Захад «рупліва выбудоўвае ўздоўж межаў нашай краіны «жалезную заслону», «у якую ўжо ўцягнуты дзяржавы Прыбалтыкі, Малдова і Грузія і куды працягваюць уключацца іншыя былыя рэспублікі СССР».

«Беларусь у гэтых умовах застаецца адзіным надзейным саюзнікам нашай краіны на заходнім стратэгічным кірунку. Менавіта Беларусь забяспечвае абарону расійскіх межаў на тым шляху, па якім адвеку на Маскву ішлі заваёўнікі. Гэта асабліва важна сёння, калі ў выніку так званай ваеннай рэформы Узброеныя сілы Расіі практычна разбураныя», — лічыць лідар расійскіх камуністаў.

«Насуперак здароваму сэнсу расійскае кіраўніцтва робіць усё, каб канчаткова разбурыць прыязныя адносіны з гэтай рэспублікай, — заявіў Зюганаў. — Толькі што кіруючыя вярхі РФ спісалі Афганістану, які кантралююць войскі НАТА і які з'яўляецца пад іх кіраўніцтвам асноўным пастаўшчыком гераіну ў Расію, рэшткі савецкага доўга ў памеры 891 млн долараў, а вось Беларусі некалькі тыдняў выкручвала рукі, патрабуючы выплаты 200 млн долараў пры ўласным доўгу перад Мінскам у 260 млн. Як разумець такую «знешнюю палітыку»?»

«Зусім відавочна, што расійскія кіраўнікі ў сваёй антыбеларускай палітыцы кіруюцца класавымі інтарэсамі заходніх партнёраў, якія люта ненавідзяць незалежную народную Беларусь і Лукашэнку, а таксама камерцыйнымі інтарэсамі расійскай алігархіі, што імкнецца захапіць сучасныя прадпрыемствы Беларусі, асабліва ў нафтагазавай галіне», — мяркуе Зюганаў.

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.07.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 983,00 | 1 чэшская крона | 153,49 |
| ▲ 1 еўра | 3 842,40 | 1 польскі злоты | 951,11 |
| 1 латвійскі лат | 5 452,39 | ▲ 1 расійскі рубель | 98,18 |
| 1 літоўскі літ | 1 119,24 | 1 украінская грыўня | 377,76 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,3839 |
| 10 UAH | 38,4801 |
| 1000 BYR | 10,1584 |
| EUR | 39,1253 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Прамая лінія

# «СЦЭНЫ МЕРЗНУЦЬ, СТОЛЬ ЛЯЦІЦЬ... А ЖЭУ НАША «СПІЦЬ»?

**На пытанні і скаргі чытачоў «Звязды» падчас прамой лініі адказвалі начальнік упраўлення эканомікі Алена ДУДЗІНСКАЯ і начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Эдмунд ГРЫШКЕВІЧ.**



***(Працяг. Пачатак у нумары за 20 ліпеня.)***

☎ ***— Вас турбуе Міхаіл Андрэевіч, я жыву па вул. К. Маркса. Працякае вада пастаянна праз столь і дах у прыбіральню, цеча нават прайшла ў калідор кватэры.***

— Пастаянна? Пры любым надвор'і?

***— Дождж пройдзе — і адразу залівае.***

— Міхаіл Андрэевіч, вы ж разумееце, што пры вашым пытанні трэба абследаваць. Колькі ўжо цячэ?

***— Трэці год .***

— А звярталіся куды?

***— Звярталіся летась. Яны нешта пазамазвалі, і нібыта не было. А толькі прыйшла вясна, дык адразу і пацякло.***

— А ліўні вось гэтыя калі былі?

***— Апошні лівень асабліва і заліў.***

— Прыйдуць да вас абследаваць, але не з ЖЭУ, а мінімум з гарадскога аб'яднання са ЖРЭУ Ленінскага раёна і нехта з Міністэрства. Вы ж разумееце, што прамога адказу зараз я не дам.

— Дахі цякуць заўжды. Шмат скаргаў. Гэта адно з самых папулярных пытанняў. Зразумела, чаму яно склалася. Гэта ўжо такое збітае пытанне. У сярэдзіне 90-х гадоў капітальны рамонт упаў да 180 тыс. м кв. у год. Сёння мы нарасцілі аб'ёмы амаль у 10 разоў.

☎ ***— Я пражываю па вул. Бялінскага, д. 7 у Мінску. У нас казырок над балконам зарос травой, мохам. Прайшлі вялікія дажджы, і адваліліся ад яго глыба кілаграмаў сем. Цудам не патрапіла на галаву.***

— Проста ад самой будаўнічай канструкцыі, ці там сабралася што?

***— Так-так, там сабралася шмат усяго. У дадатак стары дом. Мне на галаву ўвесь час падаюць цэменту кавалкі. Начальнік сказаў: добра, тэрмінова прымем меры. Тыдзень прайшоў, а ніхто нават і не з'явіўся. Адзінае, што нам зрабілі за ўвесь час — пафарбавалі першую і апошнюю прыступкі жоўтай фарбай. Па рамонце кажуць так: аплаціце палову вы, а палову мы...***

— Рамонт пад'ездаў уваходзіць у тэхабслугоўванне. Нарматыў — раз у сем год. Аднак у сувязі з тым, што гэтых грошай недастаткова, атрымліваюцца такія сітуацыі. Асобныя людзі і грамадзяне не чакаюць сваёй чаргі. Ніякіх тут парушэнняў няма, калі людзі самі ініцыятыву праяўляюць і на агульных паях робіцца рамонт пад'езда. Але не да гэтага зараз. У вас жа больш сур'ёзная сітуацыя. У вас трэба разбірацца з кіраўніцтвам ЖЭУ, чаму дом утрымліваецца ў такім стане, што парушаецца бяспека грамадзян.

***— І яшчэ такое пытанне. Каторы год у нас не стрыгуць старыя ліпы, якія блізка да дома з паўночнага боку. Яны зараслі, а гэта цвіль і г.д. Метраў 6 ад дома. Я пакінула заяву майстру ЖЭУ, але ніякай рэакцыі не было.***

— Калі з боку вуліцы, я думаю, што за гэта, хутчэй за ўсё, адказвае зелянгас Савецкага раёна. Таму туды трэба звярнуцца. Але зразумела, што летам іх ніхто чапаць не будзе. Гэта будзе праводзіцца або восенню, або зімой.

☎ ***— Мы пражываем у Мінску па вул. Ясеніна, 18. Не можам даць рады мурашкам. Скажыце, хто павінен імі займацца?***

— Праз ЖЭУ павінны падаць заяўку ў дэзстанцыю. Сабраць грошы, таму што прэпарат, напэўна, дарагі, і пасля правесці дэзынфекцыю. Гэта трэба рабіць усім домам. Патрэбна звярнуцца ў ЖЭУ, таму што менавіта яны з'яўляюцца ўпаўнаважанай асобай.

☎ ***— Вас турбуюць жыхары дома № 42 Цэнтральнай вуліцы вёскі Крывая Бяроза, Смалявіцкі раён. Дах у нас плыве. Яго зрывала некалькі разоў. А цяпер паклалі шыфер не ліст на ліст, а адзін да аднаго ўстык, і там шчыліны ўтвараюцца. Шыфер з рознымі хвалямі. 10 лістоў такіх ляжыць, а 10 лістоў такіх. Скардзімся і скардзімся. А нас усё топіць і топіць. З трэцяга па першы пад'езд паразмывала. Дом з 1993-га... Стокаў няма, казыркоў над пад'ездамі таксама... Звярталіся ў Смалявіцкую ЖКГ. Як звернемся, яны палазяць-палазяць, бітумам нешта падмажуць і ўсё.***

— А навошта на шыферны дах бітум?

***— Не ведаю. Напэўна, стыкі заліваюць (*смяецца*. — Аўт.).***

— Дому 17 год. У нас такіх праблем, напрыклад, няма па дамах,



якім і 40 гадоў, і 50. І шыферны дах — гэта ж прасцей зрабіць, чым нейкі іншы. Тут большая праблема нават не ў тым, што дах працякае. А праблема ў бяспецы (калі раптам нейкі там вецер моцны і г. д.). Трэба да вас накіраваць спецыялістаў інстытута Белжылпраект. Так проста вам адказаць нешта зараз без агляду спецыялістаў я не магу.

☎ ***— Ларыса Міхайлаўна Грынюк, г.п. Любча, Навагрудскі раён. Хто павінен адказваць за зграі сабак, што нападаюць на людзей?***

— Па-рознаму. Як мясцовыя органы ўлады распарадзяцца. Трэба звяртацца ў выканкам. Там вам паведамяць, хто за адлоў сабак адказвае. Звычайна спецыялістаў ЖКГ прызначаюць. А як у вас, невядома. Сабакі, што бадзяюцца, — вялікая праблема... Яны ж і на жывёлу свойскую нападаюць, і шаленства пераносяць, і іншае. Зараз, праўда, ужо не так. Ва Уздзенскім раёне некалькі пакусаў было. А іх жа каля 80 тыс. за год вылоўліваюць.

☎ ***— Юрый Віктаравіч з Магілёва. У мяне пытанне простае. Я вось замяніў сапсаваныя часам аконныя праёмы на лепшыя. Заплаціў 2 млн за два акны. Мне будзе нешта кампенсавана альбо не?***

— А што, у вас капітальны рамонт дома?

***— Не.***

— А як гэта вы ні з кім не дамовіліся? Узялі і купілі? Як вам кампенсуюць?

***— Я палічыў, што дрэннае трэба мяняць на добрае. Вось і ўсё.***

— Ну, вы правільна палічылі. Вы нармальны гаспадар. Вы ж іх памянялі ў сваёй уласнай кватэры. Значыць, гэта ваша ўласнасць, яе ніхто ў вас забраць не можа, але ж і кампенсаваць вам таксама ніхто не будзе гэта.

☎ ***— Клецкі раён, Грабар Васіль Васільевіч. Маё пытанне адрасавана Алене Іванаўне Дудзінскай. Мне 56 год. Працую ў Клецкім ЖКГ, участак — аграгарадок Морач. Працую я на бензагазонакасілцы «Штыль». Яна важыць 15 кг, якія я нашу на сабе ўвесь працоўны дзень. Тарыф мой — 1513 рублёў у гадзіну. За чэрвень я скасіў 28 тыс. кв. м травы (клумбы, газоны, вуліцы). Зарплата склала 420 тыс. рублёў. Я лічу, што мяне ацанілі няправільна, мая праца каштуе больш. А мне адказваюць, што тарыф пагадзінны, таму ўсё правільна. І другое пытанне. Ці маю я права на даплату за шкоднасць? Таму што ад касілкі ідзе пастаянная вібрацыя і выхлапы ад бензіну, якія ўплываюць на мой арганізм.***

— Мы правяралі Клецкую ЖКГ. На жаль, у іх сапраўды нізкая тарыфная стаўка першага разраду. Для таго, каб ім павысіць гэтую стаўку, неабходна палепшыць паказчыкі эфектыўнай працы. Гэта значыць яны павінны зарабіць. Яны не выконваюць усе тыя паказчыкі, у сувязі з якімі яны могуць павысіць гэтую стаўку. І даплаты за шкодныя ўмовы вам павінны быць і яны ёсць прапісаныя. І прэмія таксама вам павінна быць, але зыходзячы з таго, што тарыф нізкі такі заробак і атрымаўся. Я згодная, што гэта невысокі заробак, але там вось такая сітуацыя.

☎ ***— Мінск, Аляксандр. Працую ў аварыйнай службе паўгода. Мне да гэтага часу не выдалі спецадзенне. Скажыце, калі па нарматывах яно павінна выдавацца і якімі дакументамі гэта рэгулюецца?***

— Гэта павінна быць прапісана ў калектыўнай дамове. Там прапісаны тэрміны выдачы, а таксама час, на які вам яе выдаюць.

☎ ***— Сяргей, Мінск. Скажыце, калі ў кватэры ніхто не прапісаны, то за паслугі ЖКГ па гэтай кватэры я буду плаціць па сабекошце?***

— Калі ў кватэры не зарэгістраваныя па месцы жыхарства ўласнікі альбо члены яго сям'і, то аплата за тэхнічнае абслугоўванне і ацяпленне будзе ісці па тарыфах, якія забяспечваюць поўнае ўзнаўленне эканамічна абгрунтаваных выдаткаў. З 1-га ліпеня гэтая норма ўступіла ў сілу. Гэта аплата за ўсю плошчу, на якой ніхто не зарэгістраваны па месцы жыхарства. Гэта датычыцца і адлічэнняў на капітальны рамонт.

***— А за «лішнія» метры?***

— За метры, якія перавышаюць сумарную плошчу 20 кв. м на чалавека +10 на сям'ю толькі тэхнічнае абслугоўванне будзе ажыццяўляцца па тарыфах, што забяспечваюць ўзнаўленне эканамічна абгрунтаваных выдаткаў. Адлічэнні на капітальны рамонт ідуць за ўсю плошчу па звычайных тарыфах. Тое ж датычыцца і ацяплення.

**Настасся ЗАНЬКО.**

***(Заканчэнне будзе.)***

ФОКУС

**КАЛІ СУСТРАКАЮСЯ з дасведчанымі асобамі, абавязкова пытаюся ў іх пра сэнс існавання, сакрэты поспеху і гэтак далей.**

Разумны чалавек абавязкова задумваецца над такімі глабальнымі пытаннямі і ніколі не скажа: «Чуеш, не дуры галаву».

*— Таму што не сіляем мы, а дзеці далжны бацькоў глядзець, бо ў іх жа таксама дзеці ёсць, — будуе бабуля лагічны ланцужок. — Як павядзешся, так і набярэшся. Не, е ў нас сацработнікі, прыязджалі, пыталіся, каму трэба дапамога. Але на сабаку мне плаціць грошы, каб прыйшлі і насеклі мне дроў? Ці гатовых прывезлі. А мне потым трэба печ вытапіць. А я не сіляю. Лепш тыя грошы дзецям аддаць, і каб яны дзяціны доўг свой споўнілі.*

# «БАБУЛЯ, ШТО САМАЕ ВАЖНАЕ Ў ЖЫЦЦІ?»



На гэтым тыдні рыхтаваў матэрыялы па гучных справах, звязаных са злоўжываннямі службовых асобаў. Праехаў каля 1500 км па Беларусі, нагледзеўся на чалавечыя беды, трагедыі, несправядлівасці. Вырашыў заехаць да сваёй бабулі Мані ў адну з вёсачак Рэчыцкага раёна, каб галава адпачыла.

Па біяграфіі маёй бабулі можна пісаць гісторыю Беларусі XX і пачатку XXI стагоддзя. Яна прайшла і праз камуністычныя рэпрэсіі (бацька Міхаіл Лук'янавіч быў «сакратаром», і яго пасадзілі за тое, што «запісаў кулакоў у бедднякі»), і праз палачкавую сістэму ў калгасах, незалежнасць Беларусі і гэтак далей.

Гадоў дзесяць таму ў бабулі здарыўся інфаркт. У той дзень яна павінна была вяртацца ад дзяцей са сталіцы ў вёску. Але рэйс «Мінск—Камарын» адмянілі, упершыню за 20 гадоў. На аўтавакзале бабулі стала дрэнна, яе завезлі ў рэанімацыю, зрабілі аперацыю. Ніхто і не думаў, што яна здолее так доўга пражыць пасля таго.

*«Чаму так здарылася?»* — не раз задумваўся я. *«Відаць, каб бабуля расказала мне пра сваё мудрае і простае бачанне сэнсу жыцця...»*

Ядзім вясковую яечню з дранікамі, п'ём каркадэ і размаўляем, для чаго жывуць людзі.

— *Для чаго?* — усклікае бабуля, нібыта гэта самае простае пытанне ў жыцці. — *Вось для чаго. Радзі дзяцей жыла. Так і ўсе, пажалуй. А як не ўсе, так бальшанство. Хоць я цяпер і не гожая, урэмя ў мяне самае шчаслівае. Прыязджаюць дзеці, памагаюць, на зіму забіраюць. Радасна, што вы жывяце. А пакуль дзеці былі неўпараджаныя, што гэта было за жыццё. Кожны дзень хадзіла са смерцю побач. Памёр тата, праз тыдзень дачка, потым баба. Спраўлялі то пахараны, то 40 дзён, то паўгода, то год. Дзень нараджэння ніколі не спраўляла, а толькі пахараны.*

Бабуля некалькі разоў шматзначна падкрэслівала, што самае галоўнае — «застацца з чыстай душою». А гэта, напрыклад, выканаць свой абавязак перад бацькамі — дагледзець старых. Хто переступіць гэтае правіла — грэшнік.

*А пенсію ў нас самі прывозяць. Пошта едзе — «пі-пі!», на табе грошы, і добра на лапу даюць.*

*К Перваму мая дадалі 50 тысяч, к дзевятаму — 100, на Дзень незавісімасці яшчэ 50. Як для мяне, дык і радасна.*

Асцярожна пытаюся ў бабулі, ці будзе дзецям якое пакаранне за тое, што дрэнна даглядаюць бацькоў?

*— У нас у вёсцы амаль няма такога, каб дзеці адмаўляліся ад старых. Але аднаго старога не забралі-такі, ён выйшаў на двор та й памёр, і снегам замяло. Добра, што хвортачку адчыніў, людзі ішлі і пабачылі — ногі са снегу тырчаць. Яшчэ адну дзеці не сільна хацелі бачыць. Перазімавала яна адну зіму, і на гэту, што была, засталася. Былаператруджаная. Дачка яе прыехала і кажа: «Няхай бы вы сабраліся, старыя, у адну хату і сацработніка нанялі». І што? Старая гэта ў сваёй собсцвеннай хаце ўпала ля пасцелі, паламала ў бядры нагу і ляжала на выцяжцы. Дык выходзіць, што не хацелі глядзець узімку — і на табе на лета ляжачую. Хочаш не хочаш, а трэба бацькоў дагледзець. А кара Божая не бывае тым маментам і ў тую мінуту. Але яна е.*

Да бабулі Мані зайшла сястра Ліда. Якраз скончыліся навіны па беларускім тэлебачанні. Бабулі пачалі абмяркоўваць геапалітычную сітуацыю ў свеце і канфлікт з Расіяй...

А я сядзеў і думаў думу — як у мітусні жыцця часта забываюся пра родных. Бо вернасць і абавязак правяраюцца найперш у адносінах з блізкімі. Не маеш ладу ў сваёй сям'і — які ты на халеру абаронца для іншых?

У простых словах — глабальныя рэчы.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

Сітуацыя

# А ХТО АХОЎВАЕ ПОМНІКІ?

**Знішчылі тры паселішчы жалезнага веку, раскапалі старажытны могільнік, знішчылі больш за дваццаць курганоў перыяду ранняга сярэднявечча... Як такое магло быць?**

Органы пракуратуры Віцебскай вобласці па даручэнні Генеральнай пракуратуры праверылі, як выконваецца заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Высветлілася, што ў цэлым па вобласці і ў некаторых раёнах асобна нават не распрацаваны адпаведныя праграмы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Як паведаміла «Звяздзе» **Валянціна ХАДАСЕВІЧ, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці па наглядзе за выкананнем прыродаахоўнага заканадаўства,** у Бешанковіцкім, Верхнядзвінскім, Чашніцкім, Расонскім і Докшыцкім раёнах пытанні кантролю за аховай помнікаў архітэктуры нават не адлюстраваныя ў службовых абавязках кіраўнікоў райвыканкамаў (старшынь і іх намеснікаў). У большасці раёнаў гэтыя пытанні курыруюць супрацоўнік адзела культуры або музейны работнік па сумяшчальніцтве.

Работа ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, як устанавілі пракуроры, у гэтай сферы фактычна заключаецца ў аказанні метадычнай і кансультацыйнай дапамогі спецыялістам з раёнаў. А кантроль за працай апошніх адсутнічае. Пракуроры выявілі абуральныя факты. Напрыклад, пры праверцы ў Докшыцкім раёне не знайшлося... ажно тры пасяленні жалезнага веку, і больш за дваццаць курганоў ранняга сярэднявечча.

У Расонскім раёне пашкодзілі курган IX—XIII стагоддзя. Мяркуючы па стане кургана, можна зрабіць выснову, што раскапалі яго, каб здабыць пясок, некалькі гадоў таму, але гэта стала вядома толькі цяпер. А ў Сенненскім раёне пры ўстаноўцы вышкі мабільнай сувязі знішчылі курган IX—XII стагоддзяў. Між іншым, вышку паставілі ля яшчэ аднаго кургана, што можа нанесці шкоду гэтаму помніку археалогіі. У выніку адсутнасці дакументальна афармленых зон і абмежаванняў гаспадарчай дзейнасці ля помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны тэрыторыя вакол многіх з іх у дрэнным стане. У Чашніцкім раёне побач са старой царквой пасвілі жывёлу, ля помніка археалогіі — кургана — палілі вогнішчы.

Параўнальна добра работа па ахове спадчыны наладжаная ў Полацку. Але і там, як высветлілася, не ўсё ў парадку. У прыватнасці, у зоне ахоўнага ландшафту Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра незаконна прадастаўляліся грамадзянам зямельныя ўчасткі агульнай плошчай больш за 2,3 гектара. Некаторыя грамадзяне пачалі там будаўніцтва. І толькі пасля пратэсту пракурора горада незаконныя рашэнні аб выдачы зямлі адмянілі. У многіх раёнах адсутнічаюць афармленыя ахоўныя абавязкі. У выніку многія помнікі і не ахоўваюцца, на іх няма спецыяльных інфармацыйных табліц. У прыватнасці, у Мёрскім раёне кіраўніцтва мясцовага прадпрыемства «Завод паўправадніковых прыбораў «Інтэграл» не падпісала «ахоўную грамату» на фрагмент былой сядзібы Лапацінскіх. Тое, што захавалася, знаходзіцца ў жудасным стане. У Талачынскім раёне апынуўся без гаспадара стары вадзяны млын XIX стагоддзя. А ў Расонскім раёне некаторыя старшыні сельвыканкамаў падпісалі паперы, але, як высветлілася, нават не ведаюць, дзе менавіта знаходзяцца помнікі нашай спадчыны.

Па выніках праверкі падрыхтавалі болей за 60 актаў пракурорскага нагляду з мэтай ліквідацыі выяўленых парушэнняў. Каб у будучыні пазбегнуць недапрацовак і памылак. Тым больш што патрабаванні адпаведнага заканадаўства павінны выконваць усе адказныя чыноўнікі. І павінны ўрэшце быць адказныя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Навіны сталіцы

## ГАТЭЛЬ НА 600 МЕСЦАЎ ПАБУДУЮЦЬ У МІНСКІМ МІКРАРАЁНЕ КАМЕННАЯ ГОРКА

**Трохзоркавы гатэль на 600 месцаў пабудуюць у Мінску ў мікрараёне Каменная Горка, паведаміў дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віктар Янкавенка.**

Гасцініцу плануецца ўзвесці да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года, які пройдзе ў сталіцы. Усяго ж у Мінску пад праекты будаўніцтва гасцініц выдзелена 16 пляцовак. На частцы з іх будуць узведзеныя трохзоркавыя гасцініцы, даступныя масаваму турысту.

Так, трохзоркавыя гасцінічныя комплексы плануецца збудаваць на вуліцах Замкавая і Інтэрнацыянальная. Акрамя таго, такая гасцініца з'явіцца ў Чыжоўцы на скрыжаванні вуліц Ташкенцкая і Галадзеда.

На вуліцы Кірыла і Мяфодзія плануецца ўзвесці чатырохзоркавы гасцінічны комплекс, а на скрыжаванні вуліц Янкі Купалы і Максіма Багдановіча — фешэнебельны гатэль, які будзе прэтэндаваць на пяць зорак.

«З улікам праектаў, якія рыхтуюцца да рэалізацыі, фешэнебельных гасцініц да 2014 года ў Мінску павінна быць дастаткова, — адзначыў дырэктар дэпартамента. — Нядрэнна ідуць справы і з планамі па будаўніцтве масавых гатэляў, аднак іх заўсёды неабходна на парадак больш, чым чатырох- ці пяцізоркавых гасцініц».

Нагадаем, для размяшчэння ўдзельнікаў камандаў і VIP-гасцей чэмпіянату свету па хакеі 2014 года спатрэбіцца 1,5 тыс. месцаў. У некалькі разоў больш месцаў неабходна будзе выдзеліць для звычайных турыстаў і заўзятараў. Калі месцаў акажацца недастаткова, будуць выкарыстоўвацца базы адпачынку і гасцініцы, якія знаходзяцца ў радыусе 30—35 км ад беларускай сталіцы.

**Андрэй АСФУРА, БЕЛТА.**



## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *24 августа 2010 г.* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 739, У-12 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 796, У-23 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 796, У-6 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 739, У-11 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 739, У-1 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 736, У-9 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 735, У-11 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 736, У-24 |
| 2 | Кадастровый номер | 623683403101006162 | 623683403101006181 | 623683403101006180 | 623683403101006163 | 623683403101006165 | 623683403101006176 | 623683403101006171 | 623683403101006161 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1490 га | 0,1480 га | 0,1489 га | 0,1477 га | 0,1546 га | 0,1515 га | 0,1667 га | 0,1546 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 765 170 | 765 170 | 765 170 | 765 170 | 765 170 | 765 170 | 765 170 | 765 170 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 34 112 939 | 33 883 993 | 34 090 044 | 33 815 309 | 35 395 036 | 34 685 304 | 38 488 146 | 35 395 036 |
| 7 | Задаток (рублей) | 3 400 000 | 3 300 000 | 3 400 000 | 3 300 000 | 3 500 000 | 3 400 000 | 3 800 000 | 3 500 000 |

| | | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 | Лот 16 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 736, У-10 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 796, У-24 | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 102 | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 101 | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 100 | Горанский с/с, д. Жуки | Горанский с/с, д. Тейки | Крупицкий с/с, д. Каралино |
| 2 | Кадастровый номер | 623683403101006177 | 623683403101006166 | 623685510601001270 | 623685510601001269 | 623685510601001267 | 623681305101000037 | 623681317601000008 | 623683905601000146 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1517 га | 0,1465 га | 0,1415 га | 0,1415 га | 0,1410 га | 0,1745 га | 0,1660 га | 0,1535 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 765 170 | 765 170 | 859 960 | 859 960 | 859 960 | 1 097 644 | 334 000 | 719 951 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 34 731 093 | 33 540 574 | 30 000 000 | 30 000 000 | 30 000 000 | 8 000 000 | 7 000 000 | 9 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 3 400 000 | 3 300 000 | 2 900 000 | 2 900 000 | 2 900 000 | 700 000 | 600 000 | 800 000 |

| | | Лот 17 | Лот 18 | Лот 19 | Лот 20 | Лот 21 | Лот 22 | Лот 23 | Лот 24 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Крупицкий с/с, д. Закружка | Крупицкий с/с, а/г Крупица | Крупицкий с/с, д. Самуэлево | Крупицкий с/с, д. Самуэлево | Крупицкий с/с, д. Дубинки | Крупицкий с/с, д. Дубинки | Крупицкий с/с, д. Вербники | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 21 |
| 2 | Кадастровый номер | 623683905101000114 | 623683906601000475 | 623683908601000085 | 623683908601000084 | 623683903101000052 | 623683903101000051 | 623683901101000072 | 623684001601000292 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,2500 га | 0,0760 га | 0,1764 га | 0,1750 га | 0,1687 га | 0,1613 га | 0,1992 га | 0,2104 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 635 685 | 645 501 | 633 766 | 633 766 | 736 906 | 660 566 | 667 092 | 493 444 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 19 000 000 | 10 000 000 | 13 000 000 | 13 000 000 | 12 000 000 | 12 000 000 | 15 000 000 | 21 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 800 000 | 900 000 | 1 200 000 | 1 200 000 | 1 100 000 | 1 100 000 | 1 400 000 | 2 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 24.08.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 18.08.2010 г. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–10 перечисляется на расчетный счет Колодищанского сельисполкома № 3600621040065 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНК 600537220, код платежа – 04901.

На Лоты 11–13 – на расчетный счет Папернянского сельисполкома № 3604621120154, ф-л 614 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600052411, ОКПО 04430453, код платежа 04901.

На Лоты 14–15 – на расчетный счет Горанского сельисполкома № 3604621020052 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 6000537220, код платежа – 04901.

На Лоты 16–23 – на расчетный счет Крупицкого сельисполкома № 3600621050071 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600052399, код платежа – 04901.

На Лот 24 – на расчетный счет Лошанского сельисполкома № 3600621060087 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае, местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

# ШКОЛА І МАГІЧНАЕ КОЛА
## (фэнтэзі беларускага паходжання)

### Бацькі беларускамоўных школьнікаў вёскі Княгінін адстойваюць права навучання ў сваім аграгарадку

**НАС вучаць у школах толькі добраму: заўсёды дапамагаць людзям. Аднак больш чым 50-гадовая гісторыя агульнаадукацыйнай школы вёскі Княгінін Мядзельскага раёна наводзіць на роздум, нібыта нейкія сілы даўно рыхтаваліся працу звычайнай школы паралізаваць, а больш чым 80 дзяцей рассыпаць па іншых вёсках і навучыць не верыць у лепшае...**

## Кола першае.
### БРАТЭРСТВА ВЯСКОЎЦАЎ

...Дзяўчынка Жэнька адчула сябе дарослай: у яе ж цяпер ёсць школьная форма! У дзіцячым садку яна сёлета — выпускніца, у верасні пойдзе ў першы клас. Да школы гатовая, кажа мама, Таццяна Гурская. Вось і праверка з раёна засталася задаволеная ўзроўнем падрыхтоўкі да школы дзетак у садку Княгініна. Жэнька і сама ганарылася сваімі ведамі: аднойчы прыйшла і паказвае намаляваную на руцэ «дзясятку» — за тое, што прыгожа напісала квадрацікі, трохкутнікі. А праз пару дзён ізноў хваліцца дзясяткай. Мама здзіўлена пытаецца: «А хто табе яе паставіў?» — «А мяне пахвалілі, я сама і напісала. Мама, я пачынаю быць добрай...» Яўгенія — дзяўчынка надта гарэзлівая, толькі паспявай за ёй сачыць. Мама вельмі непакоіцца: што будзе, калі раптам акажацца, што школа ў Княгініне зачыняецца і дзіця трэба будзе адпраўляць у якую іншую вёску? Абедзве бліжэйшыя — яшчэ колькі кіламетраў за лесам... Як адпраўляць, як вазіць? У дождж, у слоту, у мароз... Для бацькоў гэта значыць: сядзець на працы і ўвесь дзень непакоіцца, думаць: як там дзіця? Прасцей, калі яна сама пойдзе са школы па сваёй жа вёсцы сярод сваіх людзей...

Такія ж думкі непакояць бадай усіх бацькоў цяперашніх і будучых школьнікаў вёскі Княгінін. Бо не першы год ходзяць чуткі, што школу будуць зачыняць наогул — быццам бы з-за таго, што стан не адпавядае сучасным нормам. Бяда ў тым, што школа зусім не маленькая для вясковай — 82 вучні. Асабліва крыўдна і незразумела людзям, што гэта агульнаадукацыйная школа знаходзіцца ў... аграгарадку!

Пра свой боль і трывогу жыхары вёскі Княгінін распавялі ў лісце ў рэдакцыю, пад якім стаяў 101 подпіс: «Школа ў Княгініне існуе з 1866 года. Яна працавала пры цары, пры панскай Польшчы. У самым пачатку вайны будынак школы згарэў, але адразу пасля вызвалення школа ўжо працавала. Пажар яшчэ раз напрыканцы 40-х вынішчыў будынак школы, але і ў тыя надзвычай цяжкія, галодныя гады людзі разумелі значнасць школы ў жыцці вёскі, яе аднавілі ў вельмі кароткі тэрмін. Цяперашні будынак быў пабудаваны ў 1955 годзе. З тых часоў ніводнага разу ў ім не праводзілася капітальнага рамонту...»

Княгінін — вёска вялікая: 369 гаспадарак, 860 жыхароў. Цэнтр сельскага Савета тут знаходзіцца — іншыя вёскі меншыя па колькасці насельнікаў у разы. Гэта, магчыма, адна з самых перспектыўных вёсак у раёне, бо акрамя працы на зямлі, у людзей яшчэ ёсць магчымасці для працаўладкавання — каля 10 прадпрыемстваў знаходзіцца ў Княгініне, ды і чыгуначная станцыя ў Мядзельскім раёне на шляху з Маладзечна ў Полацк. Нездарма і аграгарадок вырашылі ствараць. Новыя, пафарбаваныя ў розныя колеры, дамкі відаць яшчэ з дарогі. Ды і па вуліцах вёскі то тут, то там стаяць — замест старых. Адчуваецца, што не пустуюць: на іх прыкметы жыцця і... дзетак. Недзе — цацкі ля дома, недзе — дзіцячая вопратка памытая вісіць, недзе цікаўныя вочкі малых аглядаюць новага чалавека на вуліцы.

Дзяцей у Княгініне цяпер 120 — значна больш, чым у любой з бліжэйшых вёсак. Але жыхары кажуць, што і гэта не мяжа, бо ў аграгарадок прыбываюць маладыя сем'і з дзеткамі. Для іх ёсць садок — больш за 30 выхаванцаў. Шэсць збіраюцца сёлета пайсці ў Княгінінскую школу. І на наступны год першакласнікі будуць, і яшчэ праз год падгадуюцца, і яшчэ...

— Мой сын сёлета скончыў 10 класаў, камп'ютарамі захапляецца. Апошні год вучобы застаўся. Я непакоюся наконт будучыні школы, таму што ўвагу бацькоў імкнуцца скіраваць у бок агульнаадукацыйнай у Крывічах. А школа ў Крывічах працуе на рускай мове. У нас беларуская мова, а дзецям перабудоўвацца будзе цяжка, ды і гэта гарадская школа. Гэта можа паўплываць потым і на вынікі тэстаў, ды бал губляецца пры паступленні. У мяне дачка скончыла гэтую школу, цяпер вучыцца ва ўніверсітэце імя Сахарава. У іх класе з 12 вучняў 6 паступілі ў ВНУ! Сёлета было 2 медалісты. Выпускніца Арына Голубева набрала каля 300 балаў, збіраецца на юрфак БДУ. Ды паступленне — не галоўны паказчык, бо не ўсім жа быць вучонымі, — кажа старшыня бацькоўскага камітэта школы Алена Талайка.

Як і большасць бацькоў, яна адчула небяспеку пасля агульнага сходу, які прайшоў у школе напрыканцы навучальнага года. Былі прадстаўнікі аддзела адукацыі райвыканкама, якія распаўсюдзілі сярод бацькоў анкету з 8 пытанняў, якія людзей напалохалі. Напрыклад, трэба было адказаць: «Реализует ли учреждение образования образовательные запросы детей?» Апошняе — нібыта кропка, якую трэба паставіць: «Видите ли Вы необходимость в переводе Вашего ребенка в другое учреждение образования?»

— Амаль усе бацькі адказалі, што іх задавальняе наша школа! Мы адчувалі, да чаго ўсё ідзе, — працягвае Алена Пятроўна. — Бо з вуснаў прадстаўнікоў раённага аддзела адукацыі гучалі пра нашу школу толькі адмоўныя словы. Тое не так, гэта не гэтак, нават драбязу нейкую пералічылі — маўляў, кабінет не так афармлены... Вядома, сам будынак школы ў дрэнным стане, усе пра гэта ведаюць. Але замест таго, каб прывесці яго да ладу, намаганні накіроўваюць на тое, каб паказаць нам, бацькам, якая ў нас дрэнная школа. У нас жа 96 працэнтаў настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй, па дваццаць—трыццаць гадоў працуюць людзі, напэўна, штосьці добрае можна сказаць пра іх! Усе бацькі адчулі, што патыхае нечым дрэнным, сталі абурацца: чаму ў кіраўніцтва раёна не хапае сродкаў толькі на нашу школу? Мы спадзяваліся, што калі ствараюць аграгарадок, то і школу прывядуць у належны стан. Пасля выказванняў бацькоў напрыканцы нас супакоілі: школу не будуць зачыняць, пакуль...

## Кола другое.
### ЗАЛЮСТРОЎЕ: РАМОНТ... ПАД ЗНОС?

— МНС і санстанцыяй школа ўжо зачыненая, — паведаміла **дырэктар Княгінінскай сярэдняй школы Галіна МІСУН**. — Пастанова вынесена Мядзельскім МНС: канструкцыі, якія гараць, не апрацаваныя вогнеадпорным саставам, няма маланкааховы, печы ў непрацоўным стане, патрабаванні аб пажарнай бяспецы не выконваюцца. Так было летась, але мы адпрацавалі ўвесь год. А каля месяца таму прыйшло прадпісанне з пракуратуры, што мяне пакараюць за тое, што я падвяргаю жыццё дзяцей і выкладчыкаў небяспецы, таму што выкарыстоўваю аварыйны будынак. На пачатку кожнага навучальнага года цэлая камісія ацэньвае стан школьных будынкаў — мой подпіс у акце аб прыёмцы школы апошні. Аднак мы ўвесь час плацім штрафы — каля мільёна выклалі...

Слухаю, гляджу — і не веру ўласным вачам. Новенькія шклопакеты паблісkваюць на сонцы, свежы зялёны дах усяляе надзею. Звонку — дык прыгожая школа. Гэты будынак вельмі падобны на той, дзе для мяне пачалося падарожжа ў краіну ведаў. Аднак тады ў нас ужо грэлі батарэі. Але цяпер там Дом піянераў, бо нам хутка пабудавалі новую школу...

Абрысы Княгінінскай новай школы ўгадваюцца па пляцоўцы непадалёк. Будаўніцтва пачалі ў 1993 годзе, вырылі катлаван, заклалі падмурак. На гэтым працы скончыліся. А неўзабаве пачалі будаваць Дзягільскую базавую школу. Тая ўжо праз пару гадоў існавання была зачынена — з-за адсутнасці вучняў.

У Княгінінскай старой школе вучацца ў дзве змены. Яна вытрымлівае — звонку здаецца, што яшчэ моцная.

— Калі была камісія, то шурфы рабілі ў сценах — правяралі трываласць, на вуліцы глядзелі падмурак. Зрабілі заключэнне, што самі сцены моцныя, — тлумачыць загадчык школьнай гаспадаркі Валянціна Васілевіч і запрашае ўсярэдзіну.

Тут я адчула сябе Алісай у залюстроўі. Пластыкавыя дзверы на ўваходзе толькі вонкавыя, у другім, унутраным шэрагу выдраныя, а новыя на іх месца не паставілі — засталіся неапрацаваныя бакі дзвярнога праёма. Сцены і столі быццам бы нядаўна апрацаваныя, але шмат дзе пайшлі брудна-жоўтыя зацёкі, пасыпалася тынкоўка — адчуваецца, што залівала добра. І гэта пры новым даху!

— Гэты дах (андору) паклалі падчас рамонту ў 2008 годзе — ён ішоў па лініі аграгарадка, — тлумачыць дырэктар школы. — Тады ж паставілі і шклопакеты. Але калі толькі пачынаўся рамонт, мы звярталі ўвагу раённага аддзела адукацыі, што трэба пачынаць з ацяплення, бо печы — самае хваравітае для нас пытанне. Але вырашылі пачаць з даху.

Незразумела: жыхары вёскі сцвярджаюць, што на той момант ляжаў добры шыфер усяго 9 гадоў, нічога не цякло. Яшчэ кажуць: калі знялі шыфер, пайшлі дажджы, усё замокла. Рамонт ішоў пакутліва, 4 месяцы будынак стаяў наогул без даху. Таму дзе-нідзе ў класах будаўнікі былі вымушаны зрабіць падвясную столь — каб закрыць зацёкі. Паводле планаў, вадасцёкавыя трубы павінны былі паставіць новыя, але як кажа заўгас, засталіся старыя, па якіх вада сцякае прама пад куткі будынка — падмывае іх. Яшчэ па дакументах была запланавана супрацьпажарная апрацоўка. Але тады чаму ўзнікаюць з гэтай нагоды прэтэнзіі ў МНС? Яны могуць быць толькі ў адным выпадку — калі апрацоўку не рабілі...

На гэтым рамонт Княгінінскай школы скончыўся. Грошы, выдаткаваныя па лініі аграгарадка, былі асвоеныя. І за гэта, згодна з логікай, былі адказныя. Таксама як ёсць адказныя за якасць праведзеных працаў. Звычайна, калі заказчыка не задавальняе якасць рамонту, ён можа патрабаваць дапрацоўкі ці нават кампенсацыі. Аднак ніхто нічога не перарабляе, ніхто нічога не патрабуе ад тых жа будаўнікоў.

Заказчыкам у дадзеным выпадку быў аддзел адукацыі райвыканкама. Той самы, які цяпер надта незадаволены станам Княгінінскай школы. У якой рамонту — насамрэч патрэбнага — так і не было. Чаму? І хто за гэта адказаў? Зачараванае кола.

Каб пачаць навучальны год, — распавядае Галіна Місун. — Мы накіравалі заяўку ў аддзел адукацыі, дзе пералічылі тое, што нам неадкладна трэба зрабіць. Замяніць дзверы, каласнікі, бляху ля печак памяняць. Палічылі — 5 мільёнаў трэба, без працы. На маланкаахову заяўку таксама рабілі, ёсць копія рахунка... На нашу школу нібыта не звяртаюць увагі. Але мы рыхтуемся да 1 верасня, трошкі знаходзім пазабюджэтных сродкаў на бягучы рамонт. Набываем мэблю: калі зачынялі Осаўскую школу, узялі транспарт, паехалі туды — прывезлі сталы, шафы... Столікі — са сталоўкі другой мядзельскай школы, свяцільнікі старыя (у іх мянялі)... Праўда, дзеці, калі ездзяць на спаборніцтвы і алімпіяды, бачаць, якія ўмовы ў іншых школах: мэбля, дошкі, камп'ютары, якіх у нас 4 на ўсіх вучняў. Няўжо нашы дзеці горшыя?.. І няўжо я 1 верасня павінна павесіць замок на дзверы і сказаць: «Дзеці, у школу ісці нельга...»?

## Кола трэцяе.
### ЦУДЫ САЦКУЛЬТБЫТУ

— А я сваіх дзяцей у нашу школу не пусціла — сама там вучылася, а з таго часу нічога не змянілася. Ездзіла на працу ў вёску Выгалавічы, і дзеці там вучыліся, — распавяла Іна, супрацоўніца бара. — Некалькі сем'яў з нашай вёскі таксама аддалі дзяцей у Выгалавічы. Зразумела, каб сваю школу зрабілі, то хадзілі б сюды.

Бар у Княгініне адчыніўся нядаўна — вельмі сучасны, з новай драўлянай мэбляй, акуратнай прыбіральняй. І тоненькі тэлевізар на сцяне — раён дапамог! Увечары тут моладзь збіраецца, днём дзеці са школы заходзяць, бульбу фры бяруць. У школе ж нармальнай сталоўкі няма.

Кіраўніцтва школы спрабавала гэтую праблему вырашыць: 15 мільёнаў выбілі — ваду правялі. Вось і жыхары лічаць, што школу можна давесці да розуму, бо ўжо вялася гаворка пра тое, каб прыбудову пад спартзалу зрабіць ды паўнавартасную сталоўку. Вядома, печы ў школе — мінулы век. І самая вялікая праблема. Усе разумеюць, што патрэбна замена сістэмы ацяплення — на паравое. І ўсе разумеюць, што гэта рэальна. Настаўнікі і дзеці бачаць, як літаральна ў іх на вачах вырастаюць дамкі аграгарадка, дзе і паравое ацяпленне ставяць без праблем, і прыбіральню сучасную робяць — бо ёсць праграма, паводле якой на гэта закладзены грошы. Паводле той жа праграмы паравое ацяпленне з'явілася ў клубе — больш за 400 мільёнаў рублёў выдаткавалі, як паведаміў загадчык Уладзімір Броўка. Значыць, у прынцыпе, можна было гэта зрабіць і ў школе, дзе знаходзяцца штодня 20 настаўнікаў, 10 тэхнічных супрацоўнікаў, больш за 80 дзяцей? Прычына ў грошах. І тых, хто іх размяркоўвае.

Вось яна — самая магічная сіла чалавечага свету. Сучасныя чараўнікі — чыноўнікі, якія прымаюць рашэнні. Добрыя чараўнікі, працуючы на дзяржаву, працуюць дзеля людзей, робяць так, каб ім было зручна. Аднак калі ўзгадаць пра тое, якую ўвагу дзяржава надае развіццю аграгарадкоў, то незразумела: у чым наогул праблема? Бо для іх павінна ствараццa поўная інфраструктура. Паводле сацыяльных патрабаванняў да развіцця аграгарадкоў, школа — хіба не галоўны аб'ект, людзі маюць на гэта права! А калі яе няма ў тым выглядзе, які патрэбны, то гэта не праблема жыхароў. І яны не разумеюць, чаму ў вёсцы, дзе дзяцей шмат, не могуць давесці да розуму існуючую школу, а збіраюцца раскідаць вучняў па тых, дзе няма дзяцей?

Разумею людзей: яны працуюць і спраўна плацяць падаткі, якія ідуць у тым ліку на адукацыю і ўтрыманне тых жа чыноўнікаў. Дык нават і без спецыяльных праграм з падаткаў бацькоў Княгініна накрапала нешта ў бюджэт за больш чым 50 гадоў існавання школы — за ўвесь час, што яна не мела капрамонту праз дзяржбюджэт!

Людзі па сутнасці аказаліся закладнікамі рашэнняў тых, хто павінен быў сачыць за станам школы ўсе папярэднія гады. Тых, хто збіраўся будаваць і адмяняў будаўніцтва. Тых, хто вырашаў, калі і які рамонт рабіць. А калі ў школу нядаўна пачыналі ўкладваць грошы (зусім не малыя), значыць бачылі яе перспектыву — па логіцы рэчаў...



Княгінін сёння жыве перспектывай. У ім ёсць Дом быту, аддзяленне сувязі, 7 крамаў. Мяняецца знешне: асфальт новы на галоўных вуліцах паклалі. Амбулаторыю добрую зрабілі. Акуратны сельскі Савет з сучасным еўрарамонтам, новай мэбляй, тэхнікай... Натуральна — твар пасёлка, твар улады.

А на маю думку — сапраўдны твар улады паказвае, наколькі яна можа абараняць, задавольваць, забяспечваць самыя вострыя патрэбы сваіх жыхароў. Асабліва дзяцей. Ці я памыляюся?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

### «Такой дрэннай школы больш у раёне няма»

Са сваімі роздумамі я накіравалася да прадстаўнікоў улады. Пытанні ўзніклі да Чэслава Адамовіча, старшыні Княгінінскага сельскага Савета.

***— У будынку Савета ў вас добры рамонт...***

— Ды няшмат уклалі. Фінансаванне ішло па асобным артыкуле, аблвыканкам выдаткаваў. Таксама грошы пайшлі на рамонт крамы, амбулаторыі... 80 мільёнаў. Акрамя таго мільярд прыйшоў праз дарожнікаў: асфальт паўсюль паклалі. Адразу хацелі ўсе вуліцы заасфальтаваць, але атрымалася толькі палову, колькі хапіла грошай. Водаправод памянялі — была праблема з вадой. На гэта фінансаванне праз ЖКГ ішло. Пабудавалі сушыльны комплекс за мільярд, першы ў раёне — фінансаванне было па асобным сельскагаспадарчым артыкуле...

***— Ёсць пэўны комплекс аб'ектаў сацкультбыту, які павінен быць у аграгарадку, куды ўваходзіць школа.***

— Школа... І лазня. У нас лазняў у людзей шмат, але ў сацмінімум павінна ўваходзіць лазня. Зрабілі ўжо вонкавыя працы, засталіся ўнутраныя, але грошы скончыліся. Людзі таксама пішуць лісты. Калісьці была калгасная лазня. Наогул тры гаспадаркі былі, тры лазні. Хоць бы адну цяпер зрабіць. Ці душавыя. Па мінімуму.

***— І школа павінна быць...***

— І школа, але такая, каб у ёй усё было. На новую школу не далі грошай — гэтае пытанне ставілася. У сувязі з аграгарадком былі выдаткаваныя грошы — праз рана. Калі праекты рабілі, то ўсе патрэбы пазначалі, а як дайшло да выканання, то зрабілі толькі дах і вокны. Потым сказалі, што гэта прамежкавы аб'ект, і будучы фінансаванне нешта прыпынілася. Цяпер абяцаюць, што будуць выдзяляць грошы і дарабляць. Бо такой дрэннай школы больш у раёне няма...

### Каментуе загадчык аддзела адукацыі Мядзельскага райвыканкама Ірына РАГОЎСКАЯ:

— За перыяд 2007—2009 гадоў на мерапрыемствы, звязаныя з умацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы дадзенай установы адукацыі было затрачана 283 мільёны 957 тысяч 897 рублёў. Былі праведзены наступныя віды работ: рамонт сетак водазабеспячэння і каналізацыі, набыццё абсталявання на харчблок, рамонт даху будынка, замена вокнаў, замена плота, які агароджвае тэрыторыю, адпаведна адбываўся рамонт фасаду ўстановы адукацыі, рамонт дзвярэй і электра-мантажныя работы. Па лініі аграгарадка былі сродкі ў 2008 годзе, а ў 2009 годзе былі сродкі не аграгарадка, а мясцовага бюджэту. У 2007-м было выкарыстана 16 мільёнаў 491 тысяча 596 рублёў. У 2009 годзе — 14 мільёнаў 444 тысячы 45 рублёў. А ў 2008-м, калі ствараўся аграгарадок, было зрасходавана 253 мільёны 22 тысячы 256 рублёў на правядзенне работ па бягучым рамонце.

Але на гэтым не скончылася работа на гэтай установе адукацыі. Распрацаваны план да 2015 года аб правядзенні работ па прывядзенні навучальнай установы да сацыяльных стандартаў. У 2011 годзе запланаваны сродкі на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі па замене пячнога ацяплення. На 2012 год запланаваны сродкі на правядзенне такіх капітальных работ як будаўніцтва спартыўнай залы, рэканструкцыя харчблока і будаўніцтва кацельнай. У 2012-13 годзе работы будуць прадоўжаныя. Неабходныя сродкі для падтрымання кожнай установы адукацыі ёсць і будуць знойдзены, каб 1 верасня школа была гатовая да працы. Бліжэйшае, што мы маем на мэце зрабіць, — на 5 мільёнаў закупіць расходных матэрыялаў, дэталі да печак, каб правесці іх бягучы рамонт. У мяне ў раёне дзве школы, дзе яшчэ засталіся печкі: Княгінінская сярэдняя і Яцкавіцкая базавая агульнаадукацыйная школа.

***— Я бачыла рамонт, які быў зроблены ў 2008 годзе. Калі мы звычайна робім рамонт дома, то можам выстаўляць патрабаванні да будаўнікоў. Чаму не патрабавалі даробак?***

— Я прыйшла працаваць у 2009 годзе, бачыла, што ёсць пытанні па якасці гэтых работ. Звярталіся да арганізацый. Але арганізацыя, якая выконвала рамонт, на той момант ужо спыніла сваю дзейнасць. Ёсць моманты, якія не далі пазбегнуць няякасна выкананых работ.

***— У Княгінінскай школе дах цячэ. Як дзеці пойдуць у школу 1 верасня?***

— Паспрабуем адрамантаваць, але гэта ўсё роўна будзе бягучы рамонт.

***— Як наконт будучыні школы?***

— Ніякіх планаў па закрыцці не стаіць. На агульным сходзе мы вялі размову з бацькамі, бо той перспектыўны рамонт, які мы задумалі,ы — складаны. Мы хацелі параіцца з бацькамі і прапанавалі розныя выйсці: што рабіць далей, а можа, вас школа зусім не задавальняе і мы, карыстаючыся блізкасцю Выгалавіцкай (4 кіламетры) і Крывіцкай (10 кіламетраў) школ зможам забяспечыць дзецям навучанне? Правялі анкетаванне. І зразумелі, што людзі згодныя цярпліва чакаць, калі навучальная ўстанова будзе год ад году рабіцца лепшай. У выніку нашай размовы быў дадзены канкрэтны адказ. І пытанне было знятае...

# Таямніцы Быхаўскіх цытадэляў

### Карэспандэнт «Звязды» спусціўся ў падзямелле замка Сапегаў XVII стагоддзя і даведаўся, навошта пад 400-гадовай абарончай сінагогай быў зроблены таемны пакой

**БЫХАЎ — фарпост Вялікага Княства Літоўскага на ўсходзе. У гэтым мястэчку на Магілёўшчыне агулам захавалася не так шмат помнікаў архітэктуры. Тут яны бяруць турыстаў не колькасцю, а якасцю. Унікальная абарончая сінагога 1620-х гадоў і не менш унікальны замак Сапегаў... Быў час, калі гэта былі дзве непрыступныя цытадэлі. Сёння помнікі спазналі век няслаўя: стаяць у руінах, занядбаныя і зняважаныя. Аднак ці ўсе іх таямніцы расцерушыліся ў лабірынтах стагоддзяў?**



Пасля пажару 2004 года замак Сапегаў імкліва разбураецца.



Быхаўская абарончая сінагога збудаваная амаль 400 гадоў таму!

### Пад сінагогай археолагі знайшлі таемны пакой

Такіх аб'ектаў, як быхаўская Галоўная сінагога, у Беларусі няшмат, можна пералічыць па пальцах. Асноўных, ярка выражаных абарончых храмаў у нас захавалася 4: касцёл у Камаях, царква ў Сынкавічах, царква ў Мураванцы і Быхаўская сінагога. Даследчыкі знаходзяць абарончыя рысы яшчэ ў некаторых храмах — гэта будзе тэмай нашай асобнай публікацыі.

— Наша сінагога збудаваная ў 1620-х гадах, — распавядае **дырэктар Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея Сяргей ЖЫЖЫЯН**. — Заўважце — гэта ці не адзіная сінагога абарончага тыпу, якая захавалася ў Беларусі! Да першай паловы XX стагоддзя яна была ў прыстойным стане. У 1941 годзе ў выніку выбуху быў пашкоджаны дах — з тае пары будынак знаходзіцца ў аварыйным стане...



У сярэдзіне сінагогі захавалася біма — узвышэнне для чытання Скрутка Торы.

На нашу просьбу Сяргей Піліпавіч з мясцовымі цеслярамі адкрыў сінагогу (яна надзейна забітая дошкамі, каб не лазілі і не смецілі людзі). А патрапіць у сярэдзіну дужа хацелася, бо тут захавалася ўнікальная біма. Біма — гэта ўзвышэнне ў цэнтры сінагогі, на якім стаяў стол для чытання Скрутка Торы. З бімы звычайна чыталася таксама казань равіна. Такіх бімаў — якія б добра захаваліся — мы налічым усяго некалькі па ўсёй Беларусі...

— Звярніце ўвагу, — паказвае на купал бімы спадар Сяргей, — там захаваліся тагачасныя фрэскі!..

І гэта таксама суперэксклюзіў — такіх фрэсак, зноў жа, дзве-тры па ўсёй краіне!..

— Сінагога ўваходзіла ў сістэму быхаўскіх абарончых пабудоваў, — працягвае спадар дырэктар. — Быхаў быў даволі магутным горадам. У перыяд Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай горад быў памежны — моцны арэшак для ўсіх ворагаў! Вытрымаў навалы казакоў у сярэдзіне XVII стагоддзя... У перыяд Паўночнай вайны рускія войскі не маглі ўзяць яго доўгі час — дапамагла толькі здрада...

Абарончае прызначэнне сінагогі лёгка ўгадваецца і сёння. Магутная вежа, форма прамавугольніка 20 на 21 метр, таўшчэзныя двухметровыя сцены, байніцы наверсе... У 1990-х гадах тут праходзілі раскопкі, якія выявілі патаемны пакой — нават цэлую залу — пад сінагогай. У цэнтры яе і цяпер захаваўся калодзеж.

— А яшчэ ў час тых раскопак знайшлі парэшткі аднаго з абаронцаў сінагогі. Чалавек з пісталетам у руцэ і люлькай у зубах, выглянуў, выскачыў, каб страляць па ворагах — і ў яго патрапіла ядро. Так — з пісталетам і люлькай — ён і праляжаў тут тры стагоддзі...

Быхаўская сінагога патрабуе неадкладнай увагі з боку ўладаў. Зразумела, што каб адрэстаўраваць яе, патрэбныя шалёныя грошы. Аднак, каб затуліць дзірку ў столі — якая ўсё шырыцца і шырыцца — напэўна, будзе дастаткова некалькі жэрдак ды пару рулонаў рубероіду? Тое самае — падмазаць вежу, дзе абвалілася тынкоўка і пачынае разбурацца цэгла. Упусціўшы момант, страцім унікальны помнік!

### «Замак гіне, а мог бы быць цукерачкай для турыстаў...»

Быхаўскі замак першапачаткова меў драўляныя сцены, аднак у канцы XVI стагоддзя пачалося ўзвядзенне мураванага замка. У 1621 годзе Быхаў перайшоў да славутага Льва Сапегі, які і скончыў будаўніцтва замкавых умацаванняў. Таму і прынята замак лічыць замкам Сапегаў.

Плошча замка — уявіце сабе! — 77 на 100 метраў. Некалі ён быў аточаны равамі да 27 метраў глыбінёй (як дзевяціпавярховы дом!), а таксама земляным валам з бастыёнамі.

Сёння замак знаходзіцца ў пяць разоў горшым стане за сінагогу. І гэта прыкра, бо яшчэ 6 гадоў таму тут быў дах, вокны-дзверы, усе сцены былі цэлыя.

— Вы напэўна чулі гэтую гісторыю, — уздыхае спадар Сяргей. — Яшчэ за савецкім часам тут была мэблевая фабрыка, замак быў больш-менш дагледжаны. На пачатку 2000-х гадоў замак арандаваў прадпрымальнік па прозвішчы... Сапега! Распавядаў усім, што сваяк тых самых Сапегаў. Капаў тут нешта — мо скарбы шукаў ці што? Зрабіў у замку лесапілку. А пасля аднае ночы замак нечакана згарэў. Неўзабаве па тым пажары абрынулася яго правая частка... Цяпер, калі ён стаіць без даху, такая доля можа напаткаць і рэшту...

Рэшты абарончых вежаў імкліва разбураюцца. Самому замку актыўна дапамагаюць разбурацца мясцовыя жыхары: вырываюць са сценаў рэйкі, якімі быў умацаваны замак, відаць, за савецкім часам, і здаюць на металалом.

— Што казаць, калі мы сіламі аддзела культуры і мясцовага аддзела БРСМ месяц прыбіралі замак ад смецця, — уздыхае спадар Сяргей. — Як скончылі, дык нават у мясцовай газеце пужалі, што калі зловяць каго — вялікі штраф дадуць. І што вы думаеце? Па-ранейшаму: прыходзяць, п'юць, смецяць...

«Культурны слой» тут сапраўды ўнушальны. Быхаўчане шануюць гэтую гісторыка-культурную каштоўнасць, актыўна ёй цікавяцца, любяць бавіць тут час. Патрапіўшы ў замак, нескладана даведацца, якое піва п'юць мясцовыя жыхары і якімі чыпсамі заядаюць...

— Але людзям, якія любяць Быхаў, баліць душа за замак, — прызнаецца дырэктар музея. — Наш старшыня выканкама Мікалай Кароцін і навядзенне парадку тут ініцыяваў, і археолагаў з Магілёва запрашаў... Аднак каб рэстаўраваць замак, ці хоць бы закансерваваць, патрэбны шалёныя грошы... Гарадскому бюджэту гэта не падняць, а вобласць і рэспубліка на нас пакуль увагі не звяртаюць... Пры тым, што такіх аб'ектаў на Магілёўшчыне больш няма! Мы марым, каб замак жыў, каб тут быў музей горада, агратурыстычны цэнтр: гатэльчык, кавярня ў старадаўнім стылі, цэнтр рамёстваў... Упэўнены, з замка можна зрабіць цукерачку!..

Са спадзяваннямі, што сітуацыя пераменіцца, мы палезлі ў падзямелле замка. Падчас існавання мэблевай фабрыкі тут былі склады. На глыбіні некалькіх метраў пад зямлёй — тунэлі і пакоі, загадкавыя нішы і цэлыя залы... Гатовы аб'ект для турыстаў!..

Сяргей Жыжыян распавядае гісторыю, як немцы ўзарвалі мясцовую царкву. Я здзівіўся — бо фашысты, пры ўсёй сваёй жорсткасці, часцей за ўсё не чапалі храмаў. Большасць цэркваў і касцёлаў знішчылі ўжо пасля вайны ваяўнічыя атэісты.

— Яно так, — пагаджаецца спадар Сяргей. — Але было так, што з таго берага Дняпра савецкая артылерыя прыцэльна біла па горадзе. І немцы зразумелі, што тут нехта сядзіць і наводзіць гэтыя ўдары. Таму і ўзарвалі царкву — як найвышэйшы будынак Быхава...



На купале бімы — унікальныя фрэскі.

А яшчэ ў Быхаве ёсць будынак, дзе сядзеў Карнілаў. Сяргей Жыжыян згадвае гісторыю гэтай турмы.

— Ад пачатку гэта быў корпус кляштара кармелітаў. Пасля ўваходжання Быхава ў склад Расійскай імперыі тут зрабілі жаночую гімназію, пасля турму. А ў час рэвалюцыйных падзей 1917 года тут сядзелі Карнілаў, Дзянікін ды іншыя лідары «белага» руху...

...І Сяргей Жыжыян, і старшыня выканкама, і, упэўнены, многія іншыя жыхары Быхава — любяць свой горад. І вельмі хочуць, каб помнікі гісторыі і архітэктуры ажылі, славілі Быхаў па ўсёй краіне і за яе межамі. Аднак толькі жадання тут мала. І мясцовымі сіламі ніяк не справіцца.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

*Быхаў—Мінск.*

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

### Стральцам лепш не рызыкаваць, а Блізнятам варта прыслухацца да інтуіцыі

**АВЕН**. Асабістае абаянне дазволіць наладзіць неабходныя партнёрскія адносіны. Мінулыя заслугі могуць дапамагчы ў адкрыцці досыць перспектыўнай справы. Пачынаючы з пятніцы ўладзяцца сямейныя праблемы, пачнецца перыяд поўнага паразумення. Неспрыяльны дзень — аўторак.

**ЦЯЛЕЦ**. Калі будзеце захоўваць спакой і праявіце мэтанакіраванасць, то абавязкова даб'яцеся жаданага поспеху. Зоркі будуць на вашым баку. Трэба быць больш уважлівымі пры працы з дакументамі або матэрыяльнымі каштоўнасцямі. Заваюйце давер начальства — і перад вамі адкрыюцца новыя магчымасці. Дакажыце сваю надзейнасць. Магчымыя рознагалоссі з дзецьмі, якія лёгка ўладзіць, агучыўшы своечасовую канструктыўную прапанову.

**БЛІЗНЯТЫ**. Будуць перапаўняць творчыя ідэі і задумы. Спатрэбяцца аднадумцы, якія дапамаглі б іх увасабленню ў жыццё. Прыслухвайцеся да голасу інтуіцыі — гэта дазволіць пазбегнуць масы памылак і наблізіць да ажыццяўлення запаветнага жадання. Верагодна вырашэнне практычна ўсіх канфліктаў і дасягненне даўно жаданай згоды. У сераду лепш не ўступаць у спрэчкі і не сварыцца са сваякамі. У пятніцу паспрабуйце аб'ектыўна разлічыць свае сілы.

**РАК**. У пачатку тыдня паспрабуйце праявіць вытрымку і дыпламатычнасць. Рознагалоссі з калегамі варта ўрэгуляваць у выключна парламенцкіх выразах, як бы вам ні хацелася ўжыць мацнейшыя сродкі. Можаце завязаць мноства цікавых і карысных знаёмстваў, асабліва пасля чацвярга. У пятніцу ў поўнай меры ўсвядоміце ўсю ўладу свайго абаяння.

**ЛЕЎ**. На вашы плечы можа легчы адказная справа. Не дазваляйце іншым кіраваць гэтым працэсам — толькі пры гэтай умове поспех будзе забяспечаны. Прыкладна ў сярэдзіне тыдня наступіць зручны момант для перагляду і змены адносінаў з калегамі і начальствам. Ведайце ва ўсім меру, узважвайце кожнае сваё слова і дзеянне.

**ДЗЕВА**. Падтрымліваючы адносіны з калегамі, не раскрывайце сваіх сакрэтаў. У сярэдзіне тыдня магчымая камандзіроўка, вынікі якой станоўча адаб'юцца на вашым службовым прасоўванні. У сераду раніцай добра складаць планы на найбліжэйшую будучыню, а пачынаючы з наступнага дня — увасабляць іх у жыццё. Нядзеля — спрыяльны дзень для сямейных вечароў і сустрэч са старымі сябрамі.

**ШАЛІ**. На працы могуць паўстаць дробныя, лёгка вырашальныя непрыемнасці, якія, на жаль, зоймуць шмат часу. У сераду можаце чакаць праяў сімпатыі і падтрымкі сяброў і аднадумцаў. У чацвер магчымыя цікавыя дзелавыя сустрэчы з новымі партнёрамі, але вас можа чакаць падман. У пятніцу пажадана адкласці паездкі і камандзіроўкі.

**СКАРПІЁН**. Праявіце актыўнасць і нецярплівасць. Падвысіцца агульны тонус і палепшыцца настрой. Парада, атрыманая ад блізкага сябра, дапаможа знайсці выйсце з тупіковай сітуацыі. У сераду ваша паспяховасць будзе залежаць ад зацікаўленасці ў выніку і гатоўнасці праявіць ініцыятыву. У чацвер бліскуча справіцеся з грузам наспелых праблем. Пятніца можа прынесці нечаканую свабоду дзеянняў, пра якую пасля давядзецца пашкадаваць, — так што трымайце сябе ў руках.

**СТРАЛЕЦ**. У панядзелак не адмаўляйцеся ад дапамогі сяброў, але ў той жа час паспрабуйце не фарсіраваць падзеі. Пажадана не падвяргаць сябе неапраўданай рызыцы, вырашыўшы пераадолець занадта вялікую вышыню. Многім давядзецца ахвяраваць, а страты могуць апынуцца незаменнымі. Неабходныя і адметныя якасці для вас — шчырасць і мэтанакіраванасць. Менавіта яны дапамогуць дасягнуць жаданага поспеху. У сераду вам можа ўсміхнуцца капрызная фартуна. Суботу не варта марнаваць на вырашэнне сямейных праблем.

**КАЗЯРОГ**. Вас наведаюць новыя ідэі. Можа таксама ўзнікнуць інтэнсіўны працоўны рытм. У адносінах з партнёрамі, хутчэй за ўсё, з'явяцца пэўныя цяжкасці. Разбірацца, хто вінаваты, будзеце пазней, пакуль важна прадумаць, як выйсці з сітуацыі, якая склалася. Паспрабуйце надаць дастаткова ўвагі блізкім людзям, каб не ствараць канфліктнай сітуацыі яшчэ і дома. У чацвер будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі.

**ВАДАЛЕЙ**. Прыміце ўсе падзеі такімі, якія яны ёсць. Вы наўрад ці ў сілах нешта змяніць цяпер. Могуць наведаць разнастайныя творчыя ідэі. Не варта спадзявацца на сваю выдатную памяць — рабіце запісы. У пачатку тыдня непажадана расказваць навакольным пра свае планы. Серада — вельмі спрыяльны дзень для паездак і вандраванняў. У выхадныя дні вас можа ахапіць творчы парыў, які важна ўвасобіць адразу ж.

**РЫБЫ**. Нядрэнны тыдзень для прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. У аўторак варта быць больш асцярожнымі — пазбягайце грамадскіх мерапрыемстваў, бо неабдуманае слова стане нагодай для пагалосак. У сераду будзьце больш акуратнымі і цярплівымі ва ўсіх справах, толькі так вы даб'яцеся жаданай мэты. Чацвер адзначыцца прыўзнятым настроем. У канцы тыдня лепш з усёй рашучасцю пазбавіцца ад лішняга хламу, як матэрыяльнага, так і маральнага.





# ЛЕПЕЛЬСКІЯ ЗВЯЗДОЎЦЫ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер Звязда ўваходзіць у склад Пышнянскага сельсавета, у ёй, адной з 20 населеных пунктаў, пражываюць роўна 250 чалавек. Гэта — край кветак. Тут што ні сядзіба — батанічны сад. І, як ні дзіўна, лідарства па прыгажосці трымаюць... пенсіянеры. Ветэран працы, колішні лепшы жывёлавод Яўгенія Глухава неаднаразова перамагала ў Лепельскім раёне сваім кветкава-сажалкавым падвор'ем на вуліцы Сонечнай.

— Кветкі даюць мне шмат радасці і нават лечаць, — кажа Яўгенія Рыгораўна, абдымаючы клумбачку з рыжымі настуркамі, — зараз цвіце каля 15 відаў раслін.

Цяпер большасць працаздольнага насельніцтва Звязды жыве спадзяваннямі, што малочны камбінат «Лепелька» хутка завершыць рэканструкцыю вясковай малочнатаварнай фермы, і для многіх з'явіцца праца — крыніца дабрабыту, палепшыцца настрой, каб жыць і ўпрыгожваць сваю вёску.

— Калі ў нас з'явіцца новая вуліца (трэцяя па ліку пасля Азёрнай і Сонечнай), мы абавязкова назавём яе ў гонар газеты-партызанкі і падпольшчыцы (дарэчы, нам сёлета будзе 93 гады! — **А. К.**), — кажуць жыхары-звяздоўцы — нашчадкі славутых партызанаў лепельскага краю.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

## Закрытое акционерное общество «Сомбелбанк»

Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, д. 25
Телефоны: 328 65 82, 328 65 69

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 июля 2010 | на 1 июля 2009 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 11 403,1 | 6 427,1 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 7 016,6 | 4 195,2 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 8 988,5 | 3 270,2 |
| | для торговли | 11031 | 3 | | 3 270,2 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | 8 988,5 | |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | | |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 34 193,6 | 9 524,6 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 67 334,5 | 55 464,1 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | | |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 2 206,4 | 1 877,4 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 2 649,9 | 1 711,1 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 133 792,6 | 82 469,7 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | | |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 2 202,9 | 2 852,3 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 75 832,2 | 38 707,0 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | | |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 221,0 | 925,7 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 78 256,1 | 42 485,0 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 39 989,4 | 35 589,1 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | | |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 10 332,2 | 5 122,9 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 4 939,2 | -866,0 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 275,7 | 138,7 |
| 24 | Всего капитал | 121 | | 55 536,5 | 39 984,7 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 133 792,6 | 82 469,7 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 10 708,3 | 11 002,2 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 8 108,0 | 8 933,8 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 июля 2010 | на 1 июля 2009 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 6 029,1 | 4 455,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 3 644,7 | 2 624,5 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 2 384,4 | 1 830,5 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 11 005,1 | 5 505,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 775,0 | 331,7 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 10 230,1 | 5 173,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 1 582,5 | 696,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | -0,8 | |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | | |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 1 006,1 | 3 445,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 1 274,6 | 1 334,1 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 7 258,2 | 5 218,6 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 788,9 | 894,6 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 1 478,4 | 341,6 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 4 939,2 | -866,0 |

**Председатель Правления** Т.М. Медведева
**Главный бухгалтер** Е.М. Папушева

ЗАО «Сомбелбанк», лицензия № 25 от 13.11.2008 г., выдана НБ РБ, УНП 807000122.

# КАНЦЭРТ ДЛЯ... ВЕРАБ'ЁЎ, ПЕЎНЯ І САБАКІ

Ужо шмат гадоў наша сям'я мае сядзібу з летнікам, а пераначаваць там мы штосьці ні разу не выбраліся. Па-першае, у доме не праведзена святло, а да ўчастка не падведзена вада. Добра яшчэ, што суседзі дазваляюць карыстацца свідравінай... Па-другое, не дужа падабалася прывязка да аўтобуса, ад якога ісці з кіламетр з усімі клункамі, у тым ліку і з тэрмасам, досыць цяжка. Па-трэцяе... Відаць, проста прывыклі да зручнасцяў гарадской кватэры. І ўсё ж...



З'явілася адразу некалькі нагод здзейсніць задуманае. Па-першае, набылі ўласнае аўто. Па-другое, анамальная гарачыня дазваляе шчыраваць на сотках альбо позна ўвечары, альбо раніцай. А пасля можна толькі ляжаць на падлозе і праз кожныя пяць хвілін апырскваць сябе вадой.

Рашэнне паехаць з начоўкай саспела хутка. Раз! — і ўсё. Хто «за»? Усе... Значыць, чакаем, пакуль хоць трохі сыдзе спёка, каб не апячы рукі аб руль. І — наперад!

Субота. Восем вечара. На сядзібе — такая любата! Ці нават «ляпата», як казаў герой любімай камедыі. Дзённая спякота ўжо сышла, саступіўшы месца вячаровай прахалодзе. Адноснай, вядома... І ўсё ж ужо можна ўдыхнуць на поўныя грудзі — і не апячыся гарачым паветрам...

Кудысьці падзеліся нават камары, якія сёлета як ніколі бязлітасныя і да дачнікаў, і да наведвальнікаў лесу. Карацей, ніводнай крыніцы для раздражнення. Толькі замілаванне і любасць пануюць у душы. Бог ты мой, як жа гэтага не хапае ў паўсядзённасці!

І ўвогуле, штосьці дзіўнае творыцца з душою... Яна так чулліва рэагуе на кожную дробязь... Вось лаўка, нядаўна змайстраваная татам. Яе абавязкова трэба пафарбаваць. Але, зрэшты, і такая падабаецца. На лаўцы ляжаць два яблыкі. Калі яны выспяваюць, тоналіваюцца сокам так, што ён добра відаць пад празрыстай скуркай. Менавіта гэты гатунак любяць восы і шэршні. Ад іх налётаў цяжка знайсці паратунак...

Дык вось вочы ўхапілі гэты малюнак — два яблыкі на драўлянай лаўцы. І адразу ж прыгадаўся такі ж — з далёкага дзяцінства. У вёсцы Мрочкі, што на Уздзеншчыне, на татавай малой радзіме, у бабулі былі вельмі смачныя яблыкі. Бывала, назбіраеш іх у кош, пасля выбераш самыя прыгожыя, пакладзеш на лаўку і... сарвешся ды пабяжыш гойсаць па вуліцы. Праз пэўны час вяртаешся назад... Як жа пахлі тыя яблыкі, нагрэтыя сонцам... Якімі смачнымі яны былі...

Мяккія прыцемкі неўпрыкмет ахопліваюць ціхую дачную вуліцу, пяшчотна абкручваюцца вакол хатаў і, здаецца, з лагоднай усмешкай зазіраюць табе ў твар, падміргваюць, пытаюцца: «Ну як? Хораша з намі?» Вядома ж, хораша...

Усё, што было запланавана на гэты вечар, зроблена. Цяпер можна ціха пагуляць па ўтравелай дарозе, не думаючы аб праблемах, а толькі захапляючыся наваколлем, дыхаючы на поўныя грудзі...

Такое звычайнае дагэтуль, яно, наваколле, здаецца, раптоўна змянілася. Бы па ўзмаху чароўнай палачкі, зрабілася больш прывабным, мяккім... Але хопіць прагулак. Час класціся спаць, бо заўтра — ранні пад'ём, каб да надыходу спёкі паспець папрацаваць на зямлі...

Я марыла: як прачнуся, паляжу колькі хвілін, сам-насам са сваімі новымі адчуваннямі. Атрымалася ж... пабудка. Напачатку зацырыкалі вераб'і. Відаць, прачнуліся і сабраліся на ранішнюю нараду. Месцам жа яе правядзення абралі дах суседняга дачнага дома, што стаіць зусім побач з нашым. Пасля да гэтага далося звонкае «ку-ка-рэ-ку!» Яно паўтаралася праз аднолькавыя прамежкі часу. А затым далучыў свой голас суседскі сабака, які заўсёды сядзіць на ланцугу. Ён брахаў з такой асалодай... Да таго ж беспераппынна, на працягу хвілін дзесяці. Склалася ўражанне, што такім чынам лёгкія распрацоўваў. А пятай гадзіне раніцы.

Карацей, сапраўдны канцэрт атрымаўся. Мне нават захацелася яго запісаць з дапамогай нотаў. І назваць «Канцэрт для вераб'ёў, пеўня і сабакі» — па аналогіі з «Канцэртам для скрыпкі з аркестрам».

А пасля была цудоўная раніца — з умываннем пад самаробным рукамыйнікам, з простай вясковай ежай і той нетаропкасцю ў дзеяннях, якая яшчэ захавалася з мінулага надвячорка, але цяпер ужо называлася лянотай.

Спёка ў той дзень надышла дужа хутка, абхапіла, абвілася вакол, прымушаючы шукаць паратунку дома, пад халодным душам. І мы вярнуліся ў горад...

Здаецца, звычайны эпізод будзённага жыцця. У кагосьці іх было — не злічыць. Але калі зірнуць на ўсё гэта вачыма рамантыка, то душа ўзварухнецца і замрэ ў захапленні.

Вось чаму жыхароў вялікіх тлумных гарадоў так прываблiваюць беларускія аграсядзібы, дзе можна адчуць такую еднасць з прыродай, якую нават у думках не ўяўляў. А што датычыцца ўладальнікаў дачных сядзібаў, то нам ужо дастаткова таго, што маем... Вось такога пяшчотнага надвячорка... Паху недаспелых яблыкаў на драўлянай лаўцы, нагрэтай сонцам... І ранішняга канцэрта для вераб'ёў, пеўня і сабакі, якім дырыжыравала сама Прырода...

**Святлана АДАМОВІЧ. Фота аўтара.**

# ГОРАЧА? ДЫК ГЭТА Ж ЛІПЕНЬ

## Дзе і як мы адпачываем

Аляксандр ЛАКОТКА, дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар архітэктуры, доктар гістарычных навук:

— Калі гаварыць пра адпачынак, то я лічу, што самы лепшы — у родных мясцінах. Калі ж казаць пра турызм, трэба заўважыць, што сёння ён ужо не спажывецкі, турызм становіцца пазнавальным. Цяпер людзям недастаткова проста паляжаць на сонцы ў шэзлонгу і папіць вадзіцы. Цікава праехацца па Еўропе, паглядзець розныя гарады, помнікі, музеі. Нават калі людзі наведваюць экзатычныя краіны, напрыклад, Кенію, Марока, ім важна не проста сузіраць, але і атрымліваць нейкія веды.

Адпачынак бывае не толькі для цела, але і для душы. Вазьміце класікаў беларускай літаратуры (Багдановіча, Коласа), ці рускай (Пушкіна, Тургенева), хіба яны пісалі пра тое, як добра адпачываць у Італіі? Яны адпачывалі і натхняліся на радзіме. Таму шчыра кажу: я адпачываю дома, у Беларусі. Ёсць такі выраз «усе мы з хат», у ім вельмі глыбокі сэнс, амаль у кожнага Беларуса ёсць такі куток. І для мяне лепшы адпачынак на радзіме, адкуль мае маці і бацька, дзе жывуць цёзкі па прозвішчы, дзе родная вёска, дзе ведаюць і помняць, дзе школа, у якой вучыўся. Для мяне гэта Случчына, Дзятлаўшчына, Магілёўшчына. Мае бацькі — настаўнікі, мы пераязджалі з аднаго месца ў іншае, таму мая «геаграфія» малой радзімы крыху большая. Акрамя элементарнага адпачынку, навядзення парадку, у мяне ёсць занятак для душы. Акрамя навуковых даследаванняў я займаюся жывапісам, у свой час марыў вучыцца на мастака, але воляй лёсу паступіў на архітэктара. І менавіта падчас адпачынку на радзіме я магу сабе дазволіць займацца жывапісам, а хіба было б магчымае такое задавальненне на ўзбярэжжы Італіі ці пляжах Турцыі? Мой адпачынак настаў. Праз тыдзень і я паеду на Магілёўшчыну.

Галіна ЗАБУР'ЯНАВА, намеснік кіраўніка ўпраўлення сацыяльна-культурнай сферы і турызму Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

— Гэтым летам мне выпала тры дні адпачынку. У чэрвені вазіла сваіх родных з Расіі ў Белавежскую пушчу. Усе былі ў захапленні, казалі, што яны нават не ўяўлялі настолькі добрага адпачынку. Белавежскую пушчу абрала таму, што добра ведаю гэтае месца адпачынку, яго магчымасці (прыроду, сэрвіс, абслугоўванне). Белавежскую пушчу варта паглядзець, гэта неардынарныя, незвычайныя мясціны. Там не тое што паветра асаблівае — асаблівая атмасфера.

Уладзімір СТАРЫКОВІЧ, вядучы спецыяліст аддзела маркетынгу, рэкламы і інфармацыі ААТ «Белзнешэканамбанк»:



***— Уладзімір Аляксандравіч, як пераносіце сёлетнюю спёку, чым ад яе ратуецеся і ці не шкадуеце часам, што жывяце не на Паўночным полюсе, дзе не так горача?***

— Спёку пераношу, бо што ж яшчэ застаецца рабіць? Трэба жыць, працаваць, гартаваць вынослівасць. Людзі ж яшчэ недалёка прасунуліся ў мадэляванні надвор'я, але можа і не трэба ім так далёка прасоўвацца. Ратуюся халоднымі напоямі, скразнякамі ды вентылятарамі, марозівам таксама. Параю ўсім кіроўцам быць больш пільнымі і ўважлівымі, бо ў такую спёку цяжка не толькі кіраваць транспартным сродкам, але і ўвогуле знаходзіцца ў горадзе. На Паўночны полюс не хацеў бы, бо чалавеку заўсёды будзе зімой занадта холадна, улетку занадта горача. Такая яго прырода.

Аляксандр ГРАДЗЮШКА, дацэнт Інстытута журналістыкі БДУ, куратар спецыяльнасці «Журналістыка (вэб-журналістыка)», кандыдат філалагічных навук:

***— Аляксандр Аляксандравіч, наконт сёлетняй спёкі: як Вы яе пераносіце? Як змагаецеся? З'ядаеце дзясяткамі пачкаў марожанага ці п'яце зялёную гарбату?***



— Ратуюся ад спёкі ў вадаёме. Побач з домам — Цнянскае вадасховішча. Туды і езджу кожны дзень увечары. А марожанага не напасешся. Ды яно дае паратунак толькі на невялікі час. Ну, а гарбату можна і чорную піць, вялікай розніцы не адчуваю. А яшчэ ў аўтамашыне ад спёкі ратуюся. Яна ў мяне з кандыцыянерам. Калі ў салоне +22, а за акном +35, адчуваю сябе досыць утульна.

***— А ў фантанах купаліся сёлета? І ці быў наогул такі досвед у жыцці?***

— Не, у фантанах не даводзілася.

***— Ну можа часам хацелася паспрабаваць?***

— Не. Фантаны не для таго зроблены, каб у іх купаліся! Дарэчы, быў неяк у Германіі. Дык у Баварыі ў горадзе ёсць басейны пад адкрытым небам. Думаю, нам таксама можна пераняць нямецкі вопыт.

Лявон ВОЛЬСКІ, музыкант, паэт, лідар гурта N.R.M.:



***— Ці падзеліцеся думкамі, як ратуецеся ад спёкі? Ці вы наогул яе любіце?***

— Я люблю спёку на курорце, а не ў горадзе. Я рэкамендую тым, у каго ёсць вёска, ехаць туды, ці на лецішча, а ў каго ёсць кандыцыянер — ратавацца пад ім. Сам я на выхадныя ў вёску не паеду, бо ў нас канцэрт на фестывалі пад Беластокам з «Крамбамбуляй», а потым запіс новых песень, таму давядзецца недзе адкласці да серады паездку.

***— Ці можна Лявона Вольскага пабачыць у метро, які там ратуецца ад спёкі?***

— Я ва ўласнай машыне ратуюся, у мяне там кандыцыянер ёсць. Хоць метро — ёсць такі варыянт, трэба паспрабаваць, добра, што нагадалі.

***— У чацвер у вас быў канцэрт, ці не перашкодзіла спёка вашым прыхільнікам?***

— Якраз там, у клубе «Графіці», маленькае памяшканне, якое выдатна ахаладжаецца, так што праблем няма.

# Дняпроўскі асілак



**Мінчаніну Максіму Цофіну нават не ўсміхнулася, а зарагатала на ўсе 32 удача — у спякотны ліпеньскі дзень ён на рыбалцы ў Жлобінскім раёне ўпаляваў велізарнага сама! Барацьба чалавека і рыбіны-асілка працягвалася 20 хвілін, і ўрэшце сом здаўся. Яго вага склала 40 кілаграмаў, а «рост» — 175 сантыметраў. Вось такія «бярвенцы» хаваюцца ў дняпроўскіх хвалях. Як расказаў рэдакцыі Максім Якаўлевіч, рыбалкай ён захапляецца гадоў 6-7, вырас на берагах сталічнай Свіслачы. Па рыбацкую ўдачу падчас вольнага часу ездзіць у розныя куткі краіны. І нарэшце яна, удача, напаткала. Няхай і не пакідае!**

# ЛЕТА ПАТРЫЯРХА

## У гасцях у народнага паэта Беларусі Рыгора БАРАДУЛІНА ва Ушачах

**БАРАДУЛІН — патрыярх сучаснай беларускай літаратуры. Ёсць і старэйшыя (дзядзьку Рыгору ў лютым споўнілася 75), і больш пладавітыя (хоць і Барадулін выдаў пад сотню кніжак). Але такіх паэтаў — якія стварылі сваю мову, свой хранатоп, сваю паэтыку... Як вы памятаеце, сваё 75-годдзе Рыгор Барадулін сустрэў у рэанімацыі: напярэдадні ў паэта здарылася цяжкае запаленне лёгкіх з ацёкам, тэмпература была пад 40 градусаў. Але лекары шпіталя Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта (у народзе яго завуць «лечкамісія») паставілі народнага паэта на ногі. Дзядзька Рыгор чакаў лета, каб паехаць у родную хату ва Ушачах.**



— Ушачы — гэта мае асноўныя лекі, — прызнаўся нам Барадулін у садзе ля роднай хаты. — Бо ўсе пігулкі, усе адлечванні ў лякарні — гэта ўсё драбяза. Ва Ушачах я і здаравейшы, і маладзейшы, і не так галава баліць... Наогул, калі казаць высакамоўна, — гэта вяртанне да каранёў. Сапраўды, гэта добра сказана. Тут ты ўрос — і пакуль ты жывеш, ты будзеш на тым месцы, дзе ты нарадзіўся, дзе ты гадаваўся...

Ва Ушачах народнага паэта землякі любяць: за апошнія гады абкрадалі тры разы. У кабінеце майстра на гарышчы зладзеі, не здолеўшы запаліць святло, карысталіся свечкаю — пазалівалі воскам шматлікія дыпломы, кнігі з аўтографамі, часопісы, лісты, нататкі... Скончылася тым, што Барадулін звярнуўся да мясцовай міліцыі — і паставіў хату на сігналізацыю. Праблема знялася — колькі разоў сігналізацыя спрацоўвала, міліцыя прыязджала аператыўна — але гэта быў ці кот, ці вецер. Адпаведныя цыдулкі ад міліцыянтаў паэт штораз знаходзіць на стале: былі ў гэткі дзень, у гэткі час, усё праверылі — парадак!..

— Да вайны на нашай вуліцы была брукаванка, цяпер застаўся маленечкі кавалак — як млечны зямны шлях... — кажа народны паэт. — Яе збіраюцца заліць цяпер асфальтам, дык усе мясцовыя радуюцца. А для мяне гэта — як заліць асфальтам кавалак душы. Бо апроч гэтай брукаванкі, тут мала што засталося з маленства...

Барадулін падыходзіць да брамкі і паказвае.

— Вунь там жыла мая хросная матка Міклашэўская... Тут былі Васількі, у яго было шэсць дачок. Аднойчы ён звярнуўся да суседа: «Ты ведаеш, Васіль, якое ў мяне гора?..» А той яму: «Не кажы, мая таксама нарадзіла...» Цяпер застаўся толькі адзін сусед — Васіль Бялеуш, маладзейшы за мяне. Ён распавёў нядаўна, як некалі старшыня райспажыўсаюза Залман Шмуілавіч Салавей сказаў: «Ты прывязі мне дроў, толькі адну бярозу». Ён яму прывёз усе яловыя дровы, і толькі адну бярэзіну. Той крычыць: «Што ты мне прывёз?!» — «Ты ж прасіў адну бярозу, я табе і захапіў адну бярозу!» Вясёлыя былі людзі...

Дзядзька Рыгор па стане здароўя цяпер практычна не робіць нічога ў хаце. Разбірае старыя кнігі і часопісы, парадкуе запісы...

— Я па-ранейшаму раблю запісы «Ушацкага словазбору», пішу патроху вершы. Стараюся ўспомніць нешта ушацкае — гэтым і жыву.

Дзядзька Рыгор згадвае, што як быў малы — усіх пераседжваў у лазні.

— Старая была над рэчкай, я там дужа любіў парыцца... Цяпер у грамадскую я не хаджу, але хаджу да свайго суседа Васіля, у яго тут лазня. Але, вядома, столькі ўжо не магу праседзець, як раней...

Ва Ушачах дзядзьку Рыгору вершы прыходзяць лепш, чым у Мінску.

— Я ў Мінску ўсё жыццё пражыў, як на кватэры, — кажа Барадулін. — А тут я дома...

Толькі вершы Рыгору Барадуліну пішуцца цяпер збольшага сумныя. Я спытаўся, як мяркуе паэт, ці шмат хто цяпер разумее ягоную паэзію?

— Баюся, каб я сам да канца разумеў. Каб не дажыць да таго, што не будзеш разумець сам... — пачуў я адказ ад народнага паэта Беларусі.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.**
*Ушачы—Мінск.*







Рыгор БАРАДУЛІН

***Вершы. Ліпень 2010.***

*Песня пеўня, серп маладзічка,*
*Годная шляхцянка-брукаванка.*
*Тая, што мановая фіранка,*
*Гулкая гамонка малатка.*
*Болей даспадобы малатку*
*Дах даладжваць, а не дамавіну.*
*П'ю, пакуль не выпрастаю спіну,*
*Роднае паветра па глытку...*

* * *

*Ты нясеш дадому*
*Ўнучку-стому,*
*Адпачынак жмурыцца здалёк.*
*Сумна пасівеламу самому*
*Бачыць, як сівее васілёк...*

* * *

*Роспач, ненажэрная ў дзяльбе,*
*Прагне ўлады над жывой прасторай.*
*Як бы кепска ні было табе,*
*Суцяшайся тым,*
*Што будзе горай.*

* * *

*Паэзія — не прафесія,*
*Паэзія — гэта агрэсія!*

* * *

*Згубіўшы галаву,*
*Хаджу як сам не свой.*
*Жыву і не жыву.*
*Заву саву ўдавой.*
*Хлусні сваёй хлушу,*
*І стаўлю ля стаўка*
*За грэшную душу*
*Я свечку-жаўрука.*
*Мне ўтульна сон прысніць*
*У ветра ў рукаве.*
*Краплiста воск звініць,*
*А галава плыве...*

